СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.29, 19.55, 13.26;
Віцебск — 6.17, 19.47, 13.30;
Магілёў — 6.18, 19.44, 13.26;
Гомель — 6.15, 19.41, 13.26;
Гродна — 6.42, 20.12, 13.30;
Брэст — 6.47, 20.08, 13.21.
МЕСЯЦ:
Маладзік 3 красавіка.
БЛАГАВЕШЧАННЕ
ІМЯНІНЫ:
Ціхана;
Даната, Руфіма.

ЗВЯЗДА

7

КРАСАВІКА 1992 г.
аўторак, № 71 (21849)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

ВОЗГАЛАС

Абмеркавана таксама пытанне аб Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і Камітэце па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі.

Па прапанове камісій Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь разгледжаны прадстаўленні аб узнагароджанні медалём Францыска Скарыны групы творчых работнікаў за высокія дасягненні ў справе нацыянальнага адраджэння, прапагандзе культурнай спадчыны беларускага народа, а таксама аб прысваенні работнікам нацыянальнай культуры, навукі і адукацыі ганаровых званняў Рэспублікі Беларусь, узнагароджанні іх Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Учора Прэзідыум Вярхоўнага Савета абмеркаваў ход ажыццяўлення земельнай рэформы ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама пытанні, звязаныя з гатоўнасцю правядзення вясенне-палявых работ.

Прэс-служба Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

У ПРЭЗІДЫУМЕ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Пад старшынствам С. С. Шушкевіча ў мінулую пятніцу адбылося пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Абмяркоўвалася пытанне аб падрыхтоўцы да працягу дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета РБ дванаццатага склікання, у тым ліку аб справаздачы Прэзідыума Вярхоўнага Савета РБ аб рабоце за перыяд з чэрвеня 1990 года па цяперашні час. На разгляд сесіі Вярхоўнага Савета будуць прадстаўлены прапановы па ўдасканаленню функцый Прэзідыума ВС РБ з улікам заўваг, выказаных народнымі дэпутатамі Рэспублікі Беларусь.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета РБ прыняў прапанову старшыні дэлегацыі Еўрапейскага парламента па ўстаўленню адносін з дзяржавамі — удзельніцамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў пані Магдалены Хоф аб правядзенні «Тыдня Рэспублікі Беларусь» падчас адной з сесій Еўрапарламента ў Страсбургу. Мяркуецца, што «Тыдзень Рэспублікі Беларусь» пройдзе ў Еўрапарламенце ў маі бягучага года. Прадугледжваецца арганізаваць у Страсбургу выставу твораў беларускіх мастакоў і вырабаў народнай творчасці, а таксама дакументальных матэрыялаў аб незалежнай Беларусі, яе эканамічным, сацыяльным і экалагічным становішчы.

Расшырэнне падобных кантактаў будзе садзейнічаць усталяванню сувязей Рэспублікі Беларусь з парламентамі еўрапейскіх краін.

Лічыліся без весткі прапаўшымі

Установлена яшчэ 5 прозвішчаў абаронцаў Брэсцкай крэпасці, якія загінулі ў першыя гадзіны і дні Вялікай Айчыннай і лічыліся без весткі прапаўшымі. Гэта Аляксандр Шумкоў, лейтэнант, камандзір 9 стралковай роты 84 стралковага палка, Аюб Басце, лейтэнант, камандзір узвода, Федасей Гменны, сяржант 111-га асобнага сапёрнага батальёна, Цэрэн Пасугінаў, радавы 44 стралковага палка і Павел Канавалаў, малодшы ваентэхнік 31-га асобнага аўтамабільнага батальёна.

Як устанаўліваюцца прозвішчы без весткі прапаўшых? Навукова-метадычны савет Брэсцкага мемарыяла вядзе пастаянную перапіску з абаронцамі крэпасці, якія засталіся ў жывых, знаходзіць сведкавыя пацвярджэнні ў аднапалчан.

Застаецца дадаць. Хутка новыя прозвішчы будуць высечаны на мемарыяльных плітах Брэсцкай крэпасці-героя.

В. ЦАСЮК.

«За дзвюма пасадамі пагонішся—ніводнай не ўтрымаеш»

Адным з першых распараджэнняў новага міністра ўнутраных спраў Латвіі палкоўніка Чэверса было забаронена падначаленым працаваць па сумяшчальніцтву. Справа ў тым, што ў сувязі з рэзкім павелічэннем колькасці розных камерцыйных і камісійных магазінаў і каператываў, работнікі міліцыі (дакладней — паліцыі) пачалі працаваць там у якасці вартаўнікоў са сваёй формай, а калі-нікалі — і са зброяй. Менавіта супраць іх накіраваны новы загад міністра, які ўпэўнены ў зрошчванні «сумяшчальнікаў» з камерцыйнай ці іншай мафіяй. Палкоўнік Чэверс кажа, ён арганізаваў спецыяльную лятучую брыгаду па выяўленню парушальнікаў закона, якая вечарамі вышуквае па каператывах паліцэйскіх-зламыснікаў.

«ДОБРАЯ ВЕСТКА ЯВІЛАСЯ СВЕТУ»

7 красавіка праваслаўная царква адзначае адно са сваіх вялікіх святаў — БЛАГАВЕШЧАННЕ. Узгадваецца і праслаўляецца той дзень, калі Архангел Гаўрыіл паведаміў Дзеве Марыі, што ёй наканавана стаць Маці Сына Божага.

Вось як гаворыцца аб гэтым у Евангеллі паводле св. Лукі (гл. 1):

26. У шосты ж месяц пасланы быў Ангел Гаўрыіл ад Бога ў горад Галілейскі, называемы Назарэт.

27. Да Дзевы, заручанай з мужам, імя якому Язэп з дома Давідавага, імя ж Дзеве: Марыя.

28. Ангел, ўвайшоўшы да Яе, сказаў: радуйся, Дабрадатная! Госпад з Табою; багаславёна ты між жанок.

29. Яна ж, убачыўшы яго, збянтэжылася ад слоў яго і разважала, што гэта было за прывітанне.

30. І сказаў Ёй Ангел: не бойся, Марыя, бо ты набыла ласку ў Бога;

31. І вось, зачнеш у чэраве, і народзіш Сына, і дасі Яму імя: Ісус;

32. Ён будзе вялікі і Сынам Найвышэйшага назавецца, і дасць Яму Госпад Бог прастол Давіда, бацькі Яго.

33. І будзе царыць над домам Якава давеку, і Царству Яго не будзе канца.

34. Марыя ж сказала Ангелу: як будзе гэта, калі Я мужа не ведаю?

35. Ангел сказаў Ёй у адказ: Дух Святы нойдзе на Цябе, і сіла Найвышэйшага ахіне Цябе; вось чаму тое, што народзіцца, Святым назавецца Сынам Божым.

38. Тады Марыя сказала: вось Я раба Госпада; хай будзе Мне па слову твайму. І адышоў ад Яе Ангел.

Благавешчанне адзначаюць сёння і стараверы праваслаўнай царквы. Гэта плынь існуе ў рускім праваслаўі з сярэдзіны XVII стагоддзя, калі частка святароў, у тым ліку і вышэйшага сану, не прыняла рэформы патрыярха Нікана 1656 года.

Стараверы адзначаюць тыя ж самыя святы, што і астатнія праваслаўныя, а адрозніваюцца ад іх некаторымі кананічнымі асаблівасцямі: хрысцяцца двума пальцамі, «хросны» ход вакол царквы ажыццяўляецца па сонцу (а не з захаду на ўсход, як прынята па ніканаўскай рэформе), паклоны ў час богаслужэння адбіваюцца зямныя (Нікан дазволіў паясныя), прызнаецца выключна васьміканцовы крыж, літургія праводзіцца над сямю прасфорамі (у РПЦ — над пяццю), імя Сына Божага пішацца з адным «і» — Ісус.

У гэты дзень, як і на іншае свята, забараняюцца розныя работы: «На Благавешчанне дзеўка касу не пляце, а птушка гнязда не ўе». Благавешчанне ў народзе лічыцца днём надыходу вясны.

Падрыхтаваў Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

РЫНАК, ЯК ЁН ЁСЦЬ

«Мінскі кірмаш»: прадпрымальнікі разлічваюць на прыбытак

Заўтра адкрываецца «Мінскі кірмаш. Вясна-92», які будзе працаваць тры дні. Якасць абслугоўвання айчынных і замежных пакупнікоў гарантуецца—фірма «Мінскі кірмаш» праводзіць ужо не першае гандлёвае мерапрыемства такога маштабу. Яна пастараецца тым больш, што менавіта 8 красавіка спаўняецца гадавіна з дня афіцыяльнай рэгістрацыі кірмашовай фірмы.

Культура гандлю, дзелавых узаемаадносін набываецца, як вядома, не адразу. Яшчэ свежыя ў памяці ці то анекдоты, ці то байкі, якія расказвалі замежныя бізнесмены пра нашых дамаросłых прадпрымальнікаў. Маўляў, некаторыя нават падаць сябе, сваю фірму толкам не могуць: візітныя карткі ў іх чамусьці заўсёды ці «закончыліся», ці яшчэ недзе «друкуюцца».

Да гэтага ў нечым стасавалася і іншая байка — пра летуценна - манілаўскі стыль работы нашых аматараў бартэру ды цвёрдай замежнай валюты. Той ці іншы часам ледзь ці не наскокваў на багатага замежнага госця з прапановамі неадкладна заключыць кантракт. І зусім не браў у разлік, што трэба было б загадзя паклапаціцца аб дазволе — ліцэнзіі на вываз прадукцыі.

На гэтым з анекдатычнымі сітуацыямі, якія не раз узнікалі раней, можна і закончыць. За мінулы час госці «Мінскага кірмашу», асабліва яго пастаянныя ўдзельнікі, шмат чаму навучыліся, набылі навыкі заўзятых бізнесменаў. Ды і вучыцца ёсць у каго — на цяперашні кірмаш з Беларусі, іншых дзяржаў СНД, маладых незалежных краін Балтыі, з Бельгіі, Германіі, Іспаніі, Швейцарыі, Польшчы, Індыі і Кітая з'ехалася прыкладна 1.000 прадстаўнікоў.

— Яшчэ ні разу не было, каб так многа фірм выказалі жаданне ўдзельнічаць у нашым кірмашы, — сказаў прэзідэнт Саюза прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь У. Карагін.

Цяпер ужо нашы бізнесмены не будуць разводзіць у роспачы рукамі ды чухаць патылічу: маўляў, дзе і як дабіцца дазволу на вываз свайго тавару за межы Беларусі? Ва ўрадзе рэспублікі падпісаны афіцыяльны дакумент, згодна з якім міністэрствам і ведамствам даручана ліцэнзаваць увоз і вываз тавараў, па якіх будуць заключаны дагаворы паставак, прама на месцы, на самім кірмашы. Гэта адчувальная дапамога, асабліва пачынаючым камерсантам, а з другога боку — паказчык адносін рэспубліканскага ўрада да дзейнасці «Мінскага кірмашу», у прыватнасці, і да ўсталявання рыначных адносін у цэлым. Такія б падыходы—ды ва ўсіх дзяржавах Садружнасці, тады агульны гандаль, як кажуць, бяды не ведаў бы.

Галоўныя ж праблемы кірмашу сёння, відаць, звязаны з цэнамі. Калі ў цэлым суадносіны прадаўцоў і пакупнікоў тут «пяцьдзесят на пяцьдзесят», то сярод удзельнікаў з дзяржаўных прадпрыемстваў, якіх на кірмаш запісалася крыху больш палавіны ад усіх зарэгістраваных, — пакупнікоў толькі 10 працэнтаў. Чаму гэта так, зразумела: адпужваюць цэны на тавары і прадукцыю, а шмат хто з вытворцаў сёння «сядзіць» на асаблівым рэжыме крэдытавання.

У кожным мінусе, аднак, ёсць і свой плюс. Перавышэнне таварнай прапановы над попытам — гэта ўжо сапраўдная рыначная прыкмета. Кірмаш, безумоўна, пасадзейнічае і таму, каб паступова пачаў складвацца баланс — цэнавая раўнавага паміж прапановай і попытам. Таго, як гэта робіцца, нямала прыкладаў і ў гісторыі беларускай зямлі. Аказваецца, толькі ў адной Магілёўскай губерні ў канцы мінулага стагоддзя дзейнічала больш за 200 кірмашоў у год. Прадаўцы і пакупнікі, збіраючыся на іх, паступова прыходзілі да аб'ектыўных узроўняў цэн на тавары і паслугі, прычым кірмашовы механізм не даваў з'явіцца манапалісту, каб дыктаваць іншым сваю волю. І яшчэ характэрны штрых: не дазвалялася з вытворцамі, якія размяшчаліся непадалёк ад месца правядзення кірмашу, заключаць кантракты па дэмпінгавых, вельмі нізкіх цэнах. Так што нам сёння, відаць, варта што-нішто з мінулага і ўспомніць.

Не адкрыццём, вядома, будзе сказаць, што праблем сёння ў «Мінскага кірмашу» хапае. Аднак дырэктар кірмашовай фірмы Аляксандр Савін жыве і пытаннямі будучага. Скажам, за два тыдні да кірмашу заявак на ўдзел у ім тут не бралі, многіх у купцы, вобразна кажучы, «не прынялі». Чаму? Аказваецца, не хапае плошчаў, ды і тыя, што ёсць, фірма толькі часова арандуе.

— Кожная дзяржава, якая сябе паважае, мае свой нацыянальны кірмаш, — падзяліўся набалелым Аляксандр Альбертавіч. — Гэта ж люстэрка ўсяго эканамічнага жыцця. Значыць, трэба думаць аб уласным сучасным комплексе будынкаў. Што і робіцца: у лютым я прадставіў адпаведныя канцэпцыі і мэру горада, і Савету Міністраў рэспублікі. Зусім магчыма, што праз трыпяць гадоў мы будзем мець кірмашовую зону на плошчы прыблізна 45 гектараў. Фінансаваць будаўніцтва ёсць каму — гэта беларускія прадпрымальнікі, бізнесмены з іншых краін СНД, прадпрыемствы дзяржсектара, замежныя кампаніі.

Так, грошы на добрую справу ў прадпрымальніцкіх структур знойдуцца, многія з іх стаяць на нагах даволі моцна, нягледзячы на ціск фінансавападатковага прэсу. Памылковасць думкі, што яны, маўляў, мала што даюць нашай агульнай эканоміцы, не выробляюць патрэбнай прадукцыі, ужо даказана. Даказваецца гэта і тым, што прыватныя фірмы прадставілі на кірмаш такія, напрыклад, тавары ўласнага вырабу, як тэлевізары і электрамясарубкі. Ці разыдуцца яны потым па магазінах? Адказ, думаецца, вядомы.

Наогул, на кірмашы будзе прадстаўлена багата прадукцыі — лес, папера, металічны пракат, будматэрыялы і тэхніка, аўтазапчасткі, адзенне, абутак, прадукты харчавання і г. д. З'явіцца і зусім ужо навінка — будуць прапаноўвацца сертыфікаты на племянную жывёлу. Пералік тавараў і паслуг можна было б і прадоўжыць, але рабіць гэтага не будзем: многія ўбачаць іх заўтра на ўласныя вочы. Убачаць наведвальнікі кірмашу, дарэчы, і стэнд газеты «Звязда», даведаюцца аб тым, якія паслугі яна прапануе. Што ж, мы тут таксама не апошнія, справаздачу працаваць па-рыначнаму.

А дапамагае ў гэтым усім нам, па меры магчымасці, «Мінскі кірмаш» — такая ўжо сутнасць яго дзейнасці. Бо, як гаворыцца ў адным з музычных шлягераў, які некалі выконваў вядомы спявак Карэл Гот, «кірмаш едзе да нас у госці, каб лепш жылося людзям і гарадам». Тут трэба і паставіць кропку, бо лепш не скажаш.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ.

ВЯЛІКІ САВЕТ СТАРШЫНЬ

Учора ў Мінску адбылася нарада-семінар старшынь абласных, раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання), раённых у гарадах Саветаў народных дэпутатаў, кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі па праблемах рыначнай эканомікі. Яе адкрыў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларусі М. Мясніковіч. Удзельнікі нарады заслухалі даклад «Аб ходзе выканання прагрэмы пераходу да рыначных адносін і стабілізацыі эканомікі, забеспячэння сацыяльнай абароны грамадзян, фарміравання і функцыяніравання рыначнага механізма. Задачы выканкомаў Саветаў народных дэпутатаў», які зрабіў намеснік Старшыні Савета Міністраў, старшыня Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па эканоміцы і планаванню С. Лінг.

Пытанні работы прадпрыемстваў прамысловасці і дзяржаўнага кіравання матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі, пераходу да рыначных адносін у аграрным сектары эканомікі і правядзення радыкальнай рэформы будаўнічага комплексу, раздзяржаўлення і прыватызацыі ўласнасці і станаўлення прадпрымальніцтва, меры па стабілізацыі спажывецкага рынку і забеспячэнню насельніцтва прадуктамі харчавання — гэтыя і іншыя наспеўшыя праблемы сталі прадметам сур'ёзнай размовы на пленарным пасяджэнні, а затым у секцыях, дзе была прадоўжана работа. Асаблівая ўвага была ўдзелена ўдасканаленню дзейнасці выканкомаў Саветаў.

На нарадзе-семінары выступіў Старшыня Савета Міністраў Беларусі В. Кебіч. У рабоце нарады прынялі ўдзел намеснікі Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі В. Кузняцоў і В. Шаладонаў, члены Прэзідыума Савета Міністраў, старшыні пастаянных камісій Вярхоўнага Савета.

Уладзімір СКУРАТОВІЧ.

ЦЕПЛАХОДЫ ЗАСТАЛІСЯ НА БЕРАЗЕ

ПІНСК (С. Шапіра). Раней звычайнага пачалі сёлета навігацыю пінскія рачнікі. У мінулыя гады радаваліся б экіпажы: больш грузаў перавязуць, больш прыбытку атрымае параходства. Цяпер жа адправіліся ў рэйсы людзі з невясёлым настроем. З-за недахвату паліва і скарачэння заказаў на грузаперавозкі 10 буксірных цеплаходаў засталіся на прыколе. І, хутчэй за ўсё, на ўвесь сезон.

І яшчэ адна сумная навіна прыйшла з гэтага рачнога порта. Спыніла сваё існаванне мясцовая школа каманднага саставу. 22 слухачы, атрымаўшы дыпломы памочніка капітана і механіка, сталі апошнімі выпускнікамі школы. Закон рынку — няма попыту.

ДА ВЕДАМА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дзевятая сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прадоўжыць сваю работу 7 красавіка 1992 года ў 9 гадзін 30 мінут у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у Доме ўрада.

ЖАДАЕЦЕ ПРАЦАВАЦЬ ЯК УВЕСЬ ЦЫВІЛІЗАВАНЫ СВЕТ?
ЗВЯРТАЙЦЕСЯ!
(0172) 588-704
СЁННЯ Ў НАС ПА ДАСТУПНЫХ ЦЭНАХ:



- камп'ютэры IBM PC/XT (8088/10; сапрацэсар; 640 кВ RAM; 32 MB HARD; 360/360 кВ FLOPPY; манітор Super EGA; прынтэр шырокі HYUNDAI-920);
- тэлефаксы;
- ксераксы;
- тэлефоны-аўтаадказчыкі;
- прынтэры

БУХГАЛТАРАМ І БАНКІРАМ— 12-разрадныя калькулятары CASIO з друкавальным прыстасаваннем

ЗА РУБЛІ • ПА ФАКТУ АПЛАТЫ • СА СКЛАДА Ў МІНСКУ

Dainova Co.,Ltd.

Народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Генадзь КАРПЕНКА:

«ПАРАДАК—НЕ ДЫКТАТУРА, А РАСКЛАД РУХУ»

І гэтаму чалавеку некалькі разоў за адно жыццё даводзілася рэзка мяняць вектар сваіх памкненняў, кідаць аддаджаны ўчастак дзейнасці і ўладкаваны быт, каб зноў, паглыбляючы дасягнутае раней, выпрабоўваць яго на трываласць, на жыццёвасць. Перспектыўны сталічны навуковец, ён едзе ў Маладзечна і там узначальвае спачатку аддзел, потым саліднае прадпрыемства—каб пераканацца, што знойдзеныя ў выніку навуковага пошуку ідэі прыжываюцца. Стаўшы народным дэпутатам рэспублікі, атрымаўшы ў выніку даволі вострай канкурэнцыі сур'ёзную пасаду — старшыні пастаяннай камісіі, раптоўна зноў вяртаецца ў Маладзечна: людзі выбіраюць яго старшынёй гарадскога Савета. Што азначае гэтая пасада менавіта ў Маладзечна, ведаюць толькі пасвячоныя: гарадскія праблемы (жыллё, камунальная гаспадарка) абвастрыліся да ўзроўню супярэчнасцей. Пры аналізе яго біяграфіі прыходзіш да высновы: шукае цяжкасцей, плыве супраць цячэння. І пакуль — паспяхова, хоць цячэнне занадта крутое. Гэтым і вызначаўся выбар суразмоўніка напярэдадні важнай размовы ў нашым парламенце: ці правільнае русла выбралі, ці не апынуліся ва ўладзе крутых хваляў?

Прадстаўляючы адзін пункт погляду, рэдакцыя мяркуе прадаставіць свае старонкі і апанентам.

— Генадзь Дзмітрыевіч, мне расказвалі, што пад час прыходу ў інстытут парашковай металургіі вам дастаўся самы цяжкі аддзел: за два гады змянілася пяць начальнікаў. Вам удалося праз кароткі час зрабіць яго адным з лепшых у інстытуце. Напэўна, ведаеце нейкі сакрэт, які выводзіць з прарыву?

— Ведаю. І расказваю ўсім: галоўнае — ведаць, чаго ты хочаш. Чотка і без агаворак. Без жадання некаму спадабацца, з кімсьці захаваць адносіны. Галоўнае — ідэя і цвёрдасць у яе ажыццяўленні. Калі гэта карысная ідэя, правільная — яна згуртуе патрэбных людзей, тваіх аднадумцаў. А разам вы ўсё адолееце.

— Давайце адразу ж прыменім ваш метад да нашага парламенту. Ці спрацоўвае?

— Любыя аналогіі, вядома ж, маюць свае недахопы. І ўсё ж адказ на сваё пытанне вы, відаць, ведаеце і самі: не, не спрацоўвае. Іначай былі б відавочнымі і вынікі. Часу пасля выбрання сённяшняга саставу парламента прайшло нямала, а пэўных вынікаў, якія б сведчылі пра чоткі і няўхільны шлях да мэты, няма. Прычына: няма дакладнай мэты, праграмы, якая б унесла арганізуючы пачатак ва ўсю дзейнасць ВС, згуртавала ўсіх вакол галоўнага. Вось у такой абстаноўцы і ўзнікае патрэба ў рэарганізацыях, перастаноўках, каб была бачнасць работы. Многія парламенты — ў Казахстане, Украіне — нейкім чынам вылучылі дамінуючыя напрамкі, мы ж пакуль плывём па цячэнню...

— А мне здаецца, што гэта проста боязь звароту, няхай нават і не ў такой даведзенай да абсурду форме, да таталітарызму, да ўладнай структуры, якая жорстка, нерухома змацавана знізу даверху.

— Ну тады давайце, баючыся дыктатуры, адменім раскład руху паяздоў, самалётаў, аўтобусаў... Будзе вельмі дэмакратычна: паляцеў, куды і калі пажадаў. Канешне, пачнецца неразбярыха. Але затое будзе і ладстава да гонару: мы не кансерватары, мы поўныя дэмакраты. І гэтак ва ўсім, у любой сферы. Ва ўладных структурах — тым больш. Так, павінна быць самастойнасць, патрэбен граматны, аператыўны пошук аптымальных варыянтаў, але яны нічога не вартыя без стрыжня, імя якому — мэта, агульнавыпрацаваная палітыка, супольная мэтанакіраваная праца. Мы нікуды не рушым без стварэння чоткага, прадуманага інстытута ўлады, якая б знітавала ў адзінае цэлае ўладныя структуры па ўсёй рэспубліцы. Гэтага ў нас няма. Бяздумна абарваны ўсе сувязі, так і не стаўшы ўсеахопнай дакладнай сістэмай, усе саставныя часткі якой знаходзяцца ва ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці. Што робіцца, напрыклад, у Маладзечна, у Пінску, у Оршы — мала цікавіць вышэйшую ўладу ў Мінску.

— Тужыце па кіруючай і накіроўваючай руцэ? Так прагнулі ўсе мы свабоды, самастойнасці, а атрымаўшы — задыхаемся?

— Задыхаемся не ад свабоды, а ад неразбярыхі. Ёсць процьма пытанняў, вострых, балючых, якія даўно і надзейна блакіруюць рух наперад, але вырашэнне якіх патрабуе скаардынаваных, узгодненых, асвячоных заканадаўствам дзеянняў. Раздзяржаўленне сродкаў вытворчасці, прыватызацыя, абарона інтарэсаў грамадзян, развіццё камунальнай гаспадаркі — пра ўсё гэта шмат размоў, але вельмі мала практычнага клопату. Можна, вядома, стаць на даўно выпрабаваны чалавецтвам шлях вынаходніцтва веласіпедаў, назваўшы гэта ініцыятыўнасцю, але ў выніку ўсе сілы пойдуць на распрацоўку даўно відомага, адпрацаванага. Мы, старшыні Саветаў буйных гарадоў, пайшлі на змушаны крок — аб'ядналіся, стварылі каардынацыйны савет, каб хоць нейкім чынам кампенсаваць адсутнасць у рэспубліцы надзейнай улады, зацікаўленай у паўнацэнным, хуткім развіцці ўсіх рэгіёнаў.

— Мацнее структурная апазіцыя знізу?

— Якая ж апазіцыя, калі сама напрошваецца на работу, не супрацьдзейнічае, а прагне арганізацыі, упарадкаванасці, — таго, што яднае, робіць зручным для канструктыўнага прарыву. Заўважце — людзі імкнуцца не да, скажам так, суверэнізацыі асобна ўзятых тэорый, а да выпрацоўкі адзінай палітыкі, адзінага настрою, што зможа вывесці з зацяжнога крызісу. Іначай — разгул некіруемасці, прагрэсіруючая анархія, распад. Калі нехта мае на мэце менавіта гэта — дасягненне мэты блізка.

— Генадзь Дзмітрыевіч, а можа, так яно і лепей? Давайце прааналізуем выступленні многіх нашых палітыкаў, у тым ліку і Старшыні ВС. У чым корань зла? У тым, што на месцах уладу перахапіла ўчарашняя намеклатура, адстаўная партбюракратыя. Яна і блакіруе тое новае, што ідзе з Мінска. Дык, можа, няхай спачатку усё распадзецца натуральным чынам, каб людзі пераканаліся, «хто ёсць хто»? Згадзіцеся, гэта таксама тактыка.

— Гэта тактыка з таго ж разраду пустых перастановак, штучных рэарганізацый там, дзе патрэбны рашучыя, кардынальныя дзеянні. Лягчэй за ўсё спісваць адсутнасць вынікаў на нейкага абстрактнага партбюракрата (вечна нам нехта перашкаджае). На самай справе асноўнай перашкодай з'яўляецца ўласнае няўменне арганізаваць справу. Калі мае месца факт нядобрасумленнай работы, злоўжываванняў, супрацьдзеяння новаму з боку тых жа «ўзурпатараў» улады на месцах — трэба называць рэчы сваімі імёнамі, разбірацца, цывілізаваным, законным шляхам пазбаўляцца ад такіх работнікаў. Ці даводзілася вам чуць хоць пра аднаго кіруючага работніка, які пацярпеў за злоўжыванні, за кампраметацыю дзяржаўнай улады? Усё застаецца на ўзроўні хлёсткіх, эфектных размоў.

— Адзін з механізмаў выпраўлення становішча прапаноўваўся — новыя выбары кіраўнікоў мясцовых Саветаў. Дарэчы, у выніках пайменнага галасавання па гэтаму пытанню не ўбачыла вашага прозвішча сярод тых, хто падтрымаў ідэю.

— Таму што тут зноў спроба падмяніць сутнасць знешнімі эфектамі, якія ў рэшце рэшт літаральна нічога не зменяць. Па-першае, новы старшыня Савета наўрад ці будзе ў многім адрозніцца ад сённяшняга — змены ў палітычнай свядомасці, у сацыяльнай псіхалогіі вельмі марудныя. Па-другое, я не бачу логікі ў тым, каб, захоўваючы сённяшні састаў Вярхоўнага Савета, нешта мяняць на месцах. Калі патрэбны змены, то чаму рабіць выключэнне для вышэйшай улады? Гэта павінна быць адна, знітаваная сістэма, сфарміраваная па адзінаму прынцыпу — толькі тады яна будзе паўнацэнна працаваць. Па-трэцяе, адсутнасць хоць нейкіх станоўчых вынікаў прывяло да поўнай апатыі выбаршчыкаў, і новыя выбары могуць проста прывесці да безуладдзя. Але галоўнае — не ў гэтых трох прычынах. Хто б ні прыйшоў у выніку самых дэмакратычных выбараў да ўлады, ён будзе па-ранейшаму паралізаваны адсутнасцю чоткага рэгламентаваных правоў, магчымасцей, абавязкаў, у выніку чаго да нуля будуць зведзены ўсе намаганні. Не спяшайцеся зноў абвінавачваць мяне ў цягаценні да нейкіх указанняў зверху. Размова ідзе не пра ўказанні, а пра галоўнейшы атрыбут любой дзяржавы — палітыку, яе прававую рэгламентацыю.

Каб патрабаваць ад старшыні Савета, ад мэра горада нейкіх вынікаў, трэба даць яму магчымасць мець, як цяпер гаворыцца, сваю каманду. Сёння, у пераходны перыяд, любую праблему горада проста немагчыма вырашыць без прыцягнення сіл буйных (дзяржаўных!) прадпрыемстваў. Ці павінны яны каардынаваць сваю дзейнасць з уладай — таксама дзяржаўнай? Па логіцы — так, на практыцы ўсё залежыць ад жадання канкрэтнай асобы. Хто назначае кіраўніка прадпрыемства? Мінск. Але калі на гэтым прадпрыемстве пачынаюць зварочваць жыллёвае будаўніцтва, калі закрываюць дзіцячыя сады, рабочыя сталоўкі, калі сотні, тысячы чалавек выкідваюцца на вуліцу, становячыся беспрацоўнымі — куды ідуць людзі? Яны ідуць да кіраўнікоў уладных структур горада. Што яны там пачуюць? Ці патрэбны абяздоленым людзям тлумачэнні на ўзроўні хто каго назначае, хто каго кантралюе? Вось так пачынаецца поўнае нявер'е, апатыя, разгубленасць. З такімі настроямі далёка не пойдзеш.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ІДЗЁМ ДА РЫНКУ

РУБЛІ, ДОЛАРЫ І ІНФЛЯЦЫЯ

Адной з асаблівасцей руху дзяржаў Садружнасці да рынку з'яўляецца выкарыстанне ў таварна-грашовым абарачэнні разам з нацыянальнай валютай — рублямі грашовых адзінак асобных замежных краін (амерыканскіх долараў, германскіх марак і інш.). Прычым адбываецца гэта на ўмовах рэзкага зніжэння пакупніцкай здольнасці рубля, калі мы стаім на парозе гіперінфляцыі ці пераступілі яго. У праграмах пераходу да рынку ўсіх урадаў (былых і існуючых) на гэту асаблівасць не звяртаецца ўвагі. Відаць, лічыцца, што выкарыстанне замежнай валюты выхаду з найвастрэйшага эканамічнага крызісу і руху да рынку не перашкаджае.

Шматвалютнасць эканомік суверэнных рэспублік была народжана яшчэ саюзным урадам, дзеянні якога (празмерная эмісія) прывялі да абясцэньвання нацыянальных грошай. Калі ў першай палавіне 80-х гадоў без павелічэння вытворчасці прадукцыі друкавалася ад 3 да 4 мільярдаў рублёў, дык у 1991-м — больш за 90. Каб зацікавіць калгасы і саўгасы ў продажы дзяржаве збожжа, былы саюзны ўрад прыняў беспрэцэдэнтнае рашэнне— увёў аплату за частку гэтай прадукцыі ў амерыканскіх доларах, не задумваючыся над вынікамі такога кроку. З другога боку, насельніцтва, напалоханае яго дзеяннямі і інфляцыяй, пачало скупляць замежную валюту, абменны курс якой рэзка ўзрос, а пакупная здольнасць рубля яшчэ больш знізілася.

Набытыя грошы замежных краін выкарыстоўваюцца людзьмі галоўным чынам для захавання асабістых зберажэнняў ад інфляцыі. Частка іх накіроўваецца ў абарачэнне, бо ў адрозненне ад рублёў, на замежную валюту можна набыць любыя тавары.

Быццам бы нічога небяспечнага для эканомікі маладых яшчэ дзяржаў выкарыстанне замежнай валюты не нясе, нават, здавалася б, наадварот, спрыяе вырашэнню часткі праблем, звязаных з усеагульным дэфіцытам і інфляцыяй. Але гэта толькі на першы погляд. Калі ж разабрацца, дык хаджэнне замежнай валюты ва ўмовах, у якіх апынуліся суверэнныя рэспублікі, далёка не бясшкодная з'ява. Гэта падтрымлівае і развівае інфляцыйныя працэсы, істотна тармозіць стабілізацыю нацыянальнай валюты і таварна-грашовага абарачэння, узмацняе сацыяльную напружанасць у грамадстве.

Цяпер у Садружнасці звыш 600 мільярдаў наяўных рублёў і вялікая колькасць замежнай валюты, асабліва амерыканскіх долараў. Каб адначасова з апошнімі ў таварна-грашовае абарачэнне паступала і адпаведная іх наміналу колькасць матэрыяльных даброт, замежная валюта ў нас, сапраўды, была б з'явай станоўчай. Аднак асноўная маса долараў завозіцца з-за мяжы без таварнага забеспячэння. У гэтым выпадку яны ўяўляюць сабой такія ж пустыя паперкі, як і нашы беставарныя рублі. Але пры ўступленні ў абменныя адносіны замежныя грошы як больш моцная валюта, якая мае ўласцівасць канверсуемасці, забіраюць з абарачэння пэўную колькасць тавараў. Іх, адпаведна, змяншаецца для рублёвых аперацый, абясцэньванне нацыянальнай валюты ўзмацняецца, цэны ў рублях узрастаюць.

Пры вялікіх «уліваннях» у эканоміку краіны долараў і іншай замежнай валюты рост цэн рэзка абганяе колькасць грошай у абарачэнні. Калі ён перавысіць 50 працэнтаў на працягу некалькіх месяцаў запар, наступае нарастаючая гіперінфляцыя, якая яшчэ больш узмацняецца тым, што насельніцтва, страціўшы давер да рублёў, імкнецца як мага хутчэй ад іх пазбавіцца. А гэта павышае хуткасць абарачэння грашовай масы, што раўнасільна павелічэнню яе колькасці. Такім чынам, замежныя грошы, што ўваходзяць у таварна-грашовае абарачэнне без адпаведнага матэрыяльнага забеспячэння, паразітуюць на рублёвай масе і, як больш моцныя канкурэнты, аслабляюць яе, павышаюць тэмпы інфляцыйных працэсаў.

Функцыі замежнай валюты істотна адрозніваюцца ад функцый нацыянальных грошай і пры выкананні ёю ролі сродкаў накаплення. Для яе пакупкі насельніцтва забірае свае рублёвыя ўклады ў Ашчадбанку. Назад, як правіла, яны не вяртаюцца. Замежныя ж грошы не могуць быць выкарыстаны на тыя мэты, якія выконвалі рублёвыя ўклады, —на крэдытаванне, аплату працы, набыццё вытворчых рэсурсаў і іншыя расходы.

Да вострага недахвату тавараў дадаецца дэфіцыт грашовых сродкаў, паколькі пры пакупцы, напрыклад, мільярда долараў патрэбна ўзяць з Ашчадбанка 100—200 мільярдаў рублёў. З-за недахопу тавараў гэту суму кампенсаваць няма чым. Застаюцца ці далейшая эмісія, ці затрымкі з выдачай грошай прадпрыемствам—з адпаведнымі вынікамі.

Гэта адзін бок справы. Але ёсць і другі. Грошы, што паходзяць з Ашчадбанка ў рукі прадаўцоў замежнай валюты, г. зн. са сферы накаплення ў сферу абарачэння, тым самым узмацняюць попыт на тавары. Разбалансаванасць таварна-грашовага абарачэння, выкліканая зняццем укладаў, узмацняецца яшчэ больш, попыт павышаецца да ўзроўню ажыятажнага. Значыць, выкарыстанне замежнай валюты і як сродку накаплення суправаджаецца абвастрэннем інфляцыі, далейшым абясцэньваннем нацыянальных грошай.

Эмісія апошніх гадоў амаль на 150 мільярдаў рублёў «пустых» грошай, шырокае выкарыстанне ў абарачэнні і накапленні замежнай валюты прывялі да аб'ектыўнай неабходнасці змянення цэн шляхам іх лібералізацыі. Народ вымушаны расплачвацца сваімі накапленнямі і нізкім жыццёвым узроўнем за няўмелае правядзенне рэформ, звязаных з пераходам да рыначных адносін. Па сутнасці, ні адно буйное мерапрыемства, праведзенае ў гады перабудовы, не прынесла чакаемага выніку, але амаль заўсёды суправаджалася эканамічнымі пралікамі, што паскарала ўсеагульны крызіс. За кароткі тэрмін насельніцтва страціла некалькі соцень мільярдаў рублёў сваіх зберажэнняў. Па канчатковаму выніку эмісія «пустых» грошай раўназначная прамому рабаванню народа і па сваёй сутнасці а'яўляецца крымінальным злачынствам. Аднак вынікі яе прымаюцца як стыхійнае бедства, пры якім ніхто не бывае вінаваты і ніхто ні за што не адказвае.

Каб аблегчыць становішча народа ў сувязі з лібералізацыяй цэн, спрыяць стварэнню ўмоў для выхаду з глыбокага эканамічнага крызісу, мэтагодна ў кароткія тэрміны ажыццявіць наступныя меры. Па-першае, спыніць нерэгулюемае паступленне замежнай валюты ў таварна-грашовае абарачэнне, па-другое, забіраць праз спецыяльныя магазіны замежную валюту ў насельніцтва шляхам прапанавання яму самых дэфіцытных і каштоўных тавараў, набываемых дзяржавай за мяжой, па-трэцяе, забараніць разлікі ў валюце ўнутры краіны.

Менавіта так зрабілі ў Расіі ў 1923 годзе пры лібералізацыі знешнеэканамічнай дзейнасці. Дзяржава забараніла разлікі ў валюце ўнутры краіны, экспарцёры абавязваліся прапаноўваць сваю валюту Дзяржбанку, а імпарцёры маглі купіць яе толькі па асобнаму распараджэнню. Уладальнікам валюты было прадпісана захоўваць яе на спецыяльных рахунках у крэдытных установах. І так рабіла не толькі Расія. Практычна кожная краіна, каб стабілізаваць таварна-грашовае абарачэнне, абмяжоўвала хаджэнне на сваёй тэрыторыі больш моцных замежных валют.

Праўда, што такія меры неабходны, сведчаць вынікі сучаснай лібералізацыі знешнеэканамічнай дзейнасці ў рэспубліках былога Савецкага Саюза. Выхад у 1990 годзе на міжнародную арэну 26 тысяч прадпрыемстваў, не маючых вопыту экспартна-імпартных аперацый, суправаджаўся буйнымі стратамі валюты, яе нерацыянальным выкарыстаннем, вывазам за мяжу ў вялікіх аб'ёмах тавараў, якія ўнутры краіны з'яўляюцца вострадэфіцытнымі, парушэннем сувязей паміж прадпрыемствамі, якія працуюць на прывазной сыравіне, і замежнымі фірмамі, што яе пастаўляюць, крэнам у бок набыцця за валюту прадуктаў і прадметаў шырокага ўжытку замест завозу высокапрадукцыйнай тэхнікі і інтэнсіўных тэхналогій для арганізацыі ўласнай вытворчасці гэтых тавараў.

Так, у 1990 годзе было прададзена за мяжу 605,2 тысячы тэлевізараў (па 170 інвалютных рублёў за кожны), мільён 88,5 тысячы халадзільнікаў, 94 тысячы швейных машын, мільён 95 тысяч радыёпрыёмнікаў і г. д. Сваю баваўняную тканіну прадавалі па 40 капеек за метр, а чужую куплялі ў сярэднім па 1,3 рубля...

У цэлым страты ад пралікаў з цэнамі перавысілі трэць валютных расходаў. Акрамя таго, у пачатку гэтага года на рахунках прадпрыемстваў СНД у замежных банках сабралася 8 мільярдаў долараў. Гэта значыць, за мяжу пастаўлена вялікая колькасць сыравіны, энерганосьбітаў, металу, машын, іншых тавараў, якія, па сутнасці, амаль бясплатна ўдзельнічаюць у павелічэнні багацця замежных дзяржаў, у той час як уласная эканоміка задыхаецца ў цісках нястачы валютных сродкаў. Колькі размоў вядзецца аб неабходнасці стварэння ўмоў для прыцягнення замежных інвестыцый, а ў той жа час свой уласны капітал, нярэдка атрыманы цаной пазбаўлення народа элементарнага, працуе на чужую эканоміку. Дык хто каму дапамагае?

Ю. КАРНІЛАЎ,
доктар эканамічных навук, прафесар Віцебскага ветэрынарнага інстытута.

Тры эпізоды на адну тэму

«Хуткая дапамога» завярнула ў двор і спынілася. Санітары з насілкамі і ўрач, якія выбеглі з машыны, раздзвінуўшы невялікую групу людзей, наблізіліся да дзяўчынкі. Збялелыя, моцна сцянутыя вусны, счарнелы твар. Побач перапалоханая маці. «Што здарылася?» — урач нахіляецца над дзіцем. «У яе цукровы дыябет. Вось... страціла прытомнасць. Што ж гэта?» — жанчына ўсхліпвае. Хвіліна-другая, і вось ужо «хуткая дапамога» ад'язджае. Насілкі не спатрэбіліся. Маці на руках аднесла дзяўчынку...

...Груз на самалёце ў Шарамецьева даставілі своечасова. У кантэйнерах — упакоўкі з інсулінам. Рэспубліцы Беларусь груз абышоўся ў 2 мільёны долараў. На жаль, да месца прызначэння інсулін не дайшоў: капсулы замерзлі і сталі непрыгоднымі. Праўда, заходнегерманская фірма выплаціла страхоўку. Было гэта ў канцы 1991 года...

...Жанчыны спадзяваліся: народны лекар дапаможа. У маці заўсёды цепліцца надзея на лепшае, на выратаванне свайго дзіцяці. Цэлая дэлегацыя з 15 жанчын накіравалася ў Душанбе. Лекар сустрэў ветліва. Паспачуваў, абнадзеіў і... адаслаў у горы збіраць травы. Тры дні збіралі, а потым прынеслі лекару. Ён хуценька іх «зарадзіў нечым», высушыў, змяшаў і прадаў усё тым жа жанчынам. Па сто рублёў. Дзеці настоі на травах пілі, час ішоў, а хвароба не вылечвалася. Надзея, як кажуць, памірае апошняй. З'явілася рэклама ў газеце, што свае паслугі прапануе нейкі новы тыбецкі медык, які лечыць цукровы дыябет, — і тых жа 15 жанчын не спыніць. І ніхто ім ужо не дакажа, што дзіця не зможа справіцца з гэтай хваробай.

Са студзеня 1991 года «стала на ногі» мінская асацыяцыя «Дзіцячы дыябет». Бацькі хворых дзяцей вырашылі аб'яднацца. Калі сам сабе не дапаможаш — ніхто не дапаможа. Усё геніяльнае проста. На першы погляд. Сапраўды, арганізацыя ёсць, ёсць жаданне дзейнічаць, але ні грошай, ні магчымасцей амаль ніякіх. Застаюцца адны праблемы. А іх, паверце, хапае.

— У апошні час мы сутыкнуліся з найвастрэйшай праблемай — дэфіцытам інсуліну, — гаворыць старшыня асацыяцыі Павел Захараў. — Інсулін, неабходны дзецям, у рэспубліцы не выпускаецца. Афіцыяльныя заяўкі медыцынскіх устаноў, якія падаюцца ва ўрад, задавальняюцца ўсё менш і менш: валюты, як вядома, не хапае. Запасаў жа інсуліну засталося на некалькі тыдняў. Сродкі ад дабрачынных акцый, якія мы наладжваем у меру сваіх сіл, могуць толькі часткова дапамагчы дзецям. Але для вырашэння гэтай праблемы патрэбна дзяржаўная праграма экспартных закупак і развіцця вытворчасці лекаў у рэспубліцы.

Хопіць спадзявацца на дабрачыннасць. Сёння яна ёсць, заўтра — няма. Чаму не разгледзець пытанне аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў. Тым больш, што прадстаўнікі амерыканскай фірмы шукалі беларускіх прадпрымальнікаў, якія згадзіліся б арганізаваць сумеснае прадпрыемства па вытворчасці інсуліну. Але нашы «фірмачы» пакуль што да гэтай справы не дараслі. Свае грошы ўкладваць не хочуць, бо вялікіх прыбыткаў не чакаецца, ды і пачынаць з нуля няма жадання.

Цяпер аб прадуктах харчавання. Іх зараз практычна не дастаць. Я маю на ўвазе прадукты, неабходныя для паўнацэннага развіцця арганізма дзіцяці з парушаным абменам рэчываў. Рэзкі рост захворванняў на дзіцячы дыябет адбыўся пасля чарнобыльскай аварыі. Да 1986 года мы не бачылі дзяцей з камбінаванай эндакрыннай паталогіяй, а зараз — дыябет і парушэнне палавога развіцця, дыябет і валляк. І база — імунная сістэма.

Вось куды б'е радыяцыя. Які выхад? Патрэбна пастаяннае забеспячэнне экалагічна чыстымі прадуктамі харчавання. А становішча з імі нам усім добра вядома. Значыць, патрэбна мэтавая дзяржаўная праграма вытворчасці прадуктаў дзіцячага харчавання з выкарыстаннем якасных цукразаменнікаў.

Можна і далей працягваць пералік праблем. Але навошта: усе яны другасныя пасля дзвюх асноўных — інсуліну і харчавання. А пакуль, як бачым, і іх вырашыць ніяк не могуць. Зразумела, што ўзнятыя пытанні трэба разглядаць на дзяржаўным узроўні. І тут слова за ўрадам.

Паведамляем разліковы рахунак: 700222, Упраўленне АК Белпрамбудбанка па Мінскай вобласці. Мінская асацыяцыя «Дзіцячы дыябет».

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ЗАГС са службовага ўваходу

Спачатку гучаў марш Мендэльсона, потым вальс Свірыдава, за ім паланез Шапэна — цудоўная музыка для цудоўнага, незабыўнага імгнення. Плывуць над залай акорды электраарганa, здаецца толькі для іх дваіх, толькі што абвешчаных мужам і жонкай.

Што ні кажыце, а ёсць яшчэ ў нашыя дні радасныя імгненні. Для тых, хто рэгіструе ўзнікненне новай сям'і, уручае маладым пярсцёнкі, пасведчанні аб шлюбе, з такіх імгненняў складаюцца працоўныя будні. Кажуць, што да радасці, як і да гора, можна неўзабаве прызвычаіцца, але гэта не пра супрацоўнікаў ЗАГСа Фрунзенскага раёна г. Мінска. Як сваё асабістае адчуваюць яны шчасце кожнай маладой сям'і.

ЗАГС стаў рабочым месцам людзей розных прафесій. Святлана **Палуянава** адказвае за музычнае суправаджэнне ўрачыстай цырымоніі, яна іграе на электраарганe. Відэааператар Валерый **Навуменка** здымае рэгістрацыю шлюбу,

каб касета з плёнкай і на залатым вяселлі нагадала пра цудоўны час маладосці. А вось да інспектара Ірыны Сідарэнка маладыя муж і жонка ў хуткім часе зноў завітаюць з радаснай навіной. Ірына рэгіструе нараджэнне дзіцяці. Па гэтай частцы спраў нямала — у раёне пражываюць 330.000 гараджан, таму ў дапамогу інспектару набылі камп'ютэр. Неўзабаве будзе дзейнічаць яшчэ адна камп'ютэрная праграма— рэгістрацыі грамадзянскіх актаў шлюбу.

Шкада, што нельга параіць чыгачам наведаць Фрунзенскі ЗАГС — лёс сам вырашае, каму патрапіць у яго светлую, прыгожую залу. Так што паверце на слова і па-добраму пазайздросце маладажонам, якія ідуць адсюль у вялікае сямейнае жыццё.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

ПРА ЛЮДСКАСЦЬ

«ШЧАСЦЯ ВАМ, ДЗЕЦІ!..»

Мэту свайго прыезду ў «Дом дзіцяці» Алена Аляксандраўна выклала коратка: «Хачу ўзяць у вас малое». Разуменне і згода пасля грунтоўнай гутаркі былі знойдзены. І вось яна ідзе па ўтульным, светлааконным пакоі.

«Ну, — загадала сама сабе жанчына, — хто першым з гэтых немаўлят зірне на мяне, хто адклікнецца, таго і бяру». Але, як толькі падышла бліжэй, на яе стрэльнулі адразу некалькі пар вачэнят. Цікаўных, дапытлівых.

У кутку манежа засяроджана корпаўся віхрасты хлапчук, папраўляючы колы грузавічка, якія ўпарта не хацелі круціцца. Ён і глянуўся Алене Аляксандраўне. Узяла на рукі, і хлопчык звыкла, абедзвюма цёплымі ручкамі моцна абхапіў яе за шыю...

Так у сям'і Алены Аляксандраўны і Аляксандра Адамавіча Каўшоў, жыхароў вёскі Старыя Буды, што на Ляхаўшчыне, з'явіўся маленькі Ігар. Родная маці аказалася «зязюляй», кінула яго на самым пачатку жыцця і з'ехала невядома куды. Знікла бясследна, каб пазбегнуць пагарды людской і ганьбы.

Мясцовым уладам і выхавальнікам зусім не ўсё роўна, у чые рукі трапіць лёс дзіцяці. Мінула некалькі месяцаў з той першай сустрэчы, з таго першага знаёмства новых бацькоў з Ігарам, перш чым адбылося яго ўсынаўленне. Увесь гэты час Алена Аляксандраўна амаль кожны выхадны, а то і двойчы на тыдні за многія сотні кіламетраў наведвалася ў «Дом дзіцяці». Праходзіла там, як яна сама пра гэта гаворыць, падрыхтоўку, выпрабавальны тэрмін. Не, не раздумала жанчына. Людзі, ад якіх цалкам ці часткова залежала «быць ці не быць», цвёрда пераканаліся: памкненні і пачуцці Алены Аляксандраўны і Аляксандра Адамавіча самыя шчырыя, непадробныя.

Рос Ігарок рухавым, дасціпным хлопчыкам, усёй душой гарнуўся да бацькоў, і яны адказвалі яму ўзаемнасцю. Праўда, некаторыя вострыя языкі папракалі: надта ж песцяць, гладзяць па галоўцы Каўшы прыёмнага сыночка.

Між тым, Алена Аляксандраўна, працуючы ў той час у паляводчай брыгадзе, зарабляла няшмат. Выручалі ў асноўным дапамога бацькі-чыгуначніка ды падворак з парай парсючкоў, дзесяткам курэй і каровай «Кветкай».

Недзе пасля выпускных школьных экзаменаў Аляксандр Адамавіч парадаваў сына новенькім матацыклам і шыкоўным касцюмам. А як жа! Дарослы ўжо чалавек, жаніх! Зусім не супраць былі б бацькі, каб Ігар набыў прафесію ўрача, інжынера ці настаўніка. А ён падзяліўся аднойчы сваёй думкай-намерам:

— Хачу я, тата, рабочую прафесію набыць. Шафёрам ці механізатарам стану, каб бліжэй быць да цябе і мамы, каб мог дапамагаць вам...

Скупы, непадатлівы на слязу бацька на гэты раз не стрымаў яе. А перасіліўшы нахлынуўшую расчуленасць, сказаў:

— Ну вось і добра, сынок. Будзем трымацца побач, будзем разам...

На два гады адлучыўся з бацькоўскага дому Ігар. Цяпер ён вайсковец. Служыць непадалёку і пісьмы шле адно за адным. Пісьмы бацьку— мужчынская, стрыманая размова: уражанні аб няпростым сённяшнім армейскім жыцці, роспыт аб справах вясковых, аб тым, ці хапае ў калгасе «Іскра» шафёраў. Ігар — таксама шафёр. Дома, яшчэ да арміі, атрымаў вадзіцельскія правы. У арміі ўдасканаліўся, першакласным спецыялістам стаў. Піша: можна і на трактар, і на камбайн сесці. Гэта, як складзецца на месцы.

Пісьмы маці —таксама вельмі асабістыя, хоць і ў іх ніякіх сакрэтаў. «Добры дзень, мама!» І пайшлі, пайшлі ўборыстыя радкі на цэлыя чатыры старонкі. Прачулыя, сэрцам сагрэтыя словы. Просіць, каб калгасных цялят перадала маладзейшым жывёлаводам. Досыць табе, матуля, у пенсіённым узросце выконваць цяжкую работу.

Ёсць у Ігара яшчэ адзін блізкі, дарагі чалавек, якому ён піша пісьмы асабліва часта. Гэта сястрычка Алена. Лёс яе, як і ў Ігара, не зусім звычайны. Алена Аляксандраўна ўзяла дзяўчынку ў тым жа «Доме дзіцяці», дзе быў і Ігар, толькі крыху пазней. Выгадавалі Каўшы і Алену. Гэтым летам у яе школьныя выпускныя экзамены. Лічы, што на выданні дзяўчына. Не нарадуецца маці:

— Малайчынка ў мяне дачка! Усё ўмее рабіць па гаспадарцы. І абед прыгатуе, і жывёлу дагледзіць, як мае быць. І ў хаце прыбярэ-памые. А яшчэ хораша іграе на баяне— заслухаешся. І сабой прыгажуня. Але трэба, каб і спецыяльнасць у руках добрую мела. Не абавязкова інстытуцкую, хоць гэта яе асабістая справа. Няхай выбірае, да чаго душа ляжыць. Пярэчыць ніхто не будзе...

Сказала, і смутак лёгкім ценем прабег па твары жанчыны. Падумала ўслых:

— Вось пойдзе Алёнка далей вучыцца, а там, глядзіш, і замуж. Добра, каб у сваю вёску ці ў суседнюю, паблізу...

Фёдар ЛАПАНІК.

Ляхавіцкі раён.

ПУНКТ ПОГЛЯДУ

Самае страшнае— баяцца адзін аднаго

Сёння найбольш характэрнымі эмоцыямі сталі, з аднаго боку, злосць і агрэсіўнасць, а з другога — апатыя і стомленасць. Яны ствараюць той псіхалагічны фон, які ўзмацняе масавы страх. Яны заяўляюць аб сабе крывавым процістаяннем у розных рэгіёнах былога СССР. Апатыя і стомленасць абярнуліся нарастаючай хваляй страху і боязі, што захліснулі краіну пасля абмену купюр і скачка цэн.

Сёння мае калегі задалі мне пытанне: «Паўсюдна ходзяць чуткі аб набліжэнні грамадзянскай вайны. Ці праўда, што яна магчыма?» Я адказаў: «Калі ўсе навокал гаворацьдык, пэўна, будзе». Калі ў 1987 годзе саліст «ДДТ» Шаўчук, з крыху пазней І. Талькоў заспявалі аб прадчуванні грамадзянскай вайны, многіх гэта ўразіла, але мала хто тады паверыў у яе магчымасць. Мінула зусім няшмат часу, і прадчуванне вайны падзяляюць ужо вельмі многія, а дзе-нідзе яна пачалася ўжо і ахоплівае ўсё большую колькасць людзей.

Задумаемся. Большасць тых, хто ўцягваецца ў вайну, — абывацелі ў добрым сэнсе гэтага слова. Ці ж мы маглі яшчэ чатыры гады назад падумаць, што ў наш час магчымы паўтор злачынстваў, якія па ступені жорсткасці і садызму роўныя злачынствам фашыстаў і амерыканскіх салдат у В'етнаме? Ці ж можна такое ўявіць: грузіны спыняюць машыну хуткай дапамогі і забіваюць выстралам у галаву асеціна, а яго маленькае дзіця прымушаюць есці шкло, пасля чаго ўсіх падпальваюць у аўтамашыне.

Ужо вельмі многія ўспрымаюць вайну як непажаданую, але непазбежную. Знікаюць апошнія надзеі на іншае вырашэнне праблем. Расце недавер, а затым і нянавісць. Узнікае атмасфера бязвыхаднага процістаяння. Гэта не можа працягвацца бясконца — рана ці позна павінна выбухнуць.

Страх матэрыялізуецца. Страх голаду спусташае паліцы магазінаў. Страх перад павышэннем цэн прыводзіць да знікнення тавараў першай неабходнасці.

Страх асляпляе свядомасць асобнага чалавека, і ён пачынае дзейнічаць насуперак розуму. Масавы страх не проста асляпляе грамадства. Ён расколвае яго, прымушаючы людзей баяцца адзін аднаго.

Самае страшнае, што знікае выбар: можна не любіць ні «чырвоных», ні «белых», ні Яназва, ні Гарбачова, ні Пазняка, ні Малафеева, — але выбіраць жа даводзіцца паміж імі. У барыкады толькі два бакі: ці па адзін, ці — па другі.

Заўтра мой сябар ад'язджае жыць у ЗША. Чатыры гады назад я яго не зразумеў бы і падаў бы руку на развітанне толькі дзеля прыстойнасці. Але сёння я яго разумею— яго гоняць туды страх, дрэнныя прадчуванні, жаданне выратаваць дзяцей. Можна падманваць адных нейкі час, іншых — увесь час, але нельга падманваць усіх заўсёды. Як можна жыць у гэтай краіне, дзе цябе ў любы момант могуць абрабаваць, згвалтаваць, забіць; дзе дзяржава ацэньвае жыццё сваіх людзей у 10 тысяч дзяржаўных грошай (менавіта так: па нашых законах за наўмыснае забойства і крадзеж 10 тысяч дзяржаўных рублёў злачынца караецца пазбаўленнем волі на 10 гадоў); дзе пануе ўседазволенасць і белае з чырвоным пастаянна мяняюцца колерамі.

Жыццё імкліва пагаршаецца. Як гэта адчуває масавая свядомасць? Пра надзею гаварыць няма сэнсу: больш за трэць людзей на пытанне сацыёлагаў, калі яны чакаюць паляпшэння, адказваюць: «Ніколі». Што далі рэформы? 0,5 працэнта насельніцтва ўзбагацілася, а больш як 50 — сталі жабракамі.

У краіне, як і ў 1917 годзе, адбылася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, і на змену таталітарнаму ладу прыйшла анархія. На змену эйфарыі, выкліканай буржуазна-дэмакратычнай лютаўскай рэвалюцыяй, прыйшоў страх. У краіне разруха, рост злачынасці, голад, але страшней за ўсё — безуладдзе. Урады, змяняючы адзін аднаго, вызначаюцца рыторыкай, але перамен да лепшага няма. У ліпені бальшавікі праводзяць мірную дэманстрацыю, якая па віне ваеннага камітэта РСДРП(б) заканчваецца трагічна — ахвярамі. Урачыстае пахаванне казакаў-абаронцаў дэмакратыі ў Расіі. Бальшавікі аб'яўляюцца па-за законам і абвінавачваюцца ў здрадзе Айчыне. Пачынаецца іх праследаванне, многія ў турмах, астатнія ў глыбокім падполлі.

Але ідзе час, нялёгка даецца следства, галоўных кіраўнікоў бальшавікоў цяжка абвінаваціць у намеры дзяржаўнага перавароту, а тым больш — у здрадзе Айчыне. І вось ужо бальшавікі становяцца нацыянальнымі героямі, нявінна пацярпеўшымі, і ўжо ў кастрычніку яны прыходзяць да ўлады. Але перад гэтай падзеяй, таксама ж, як і ў жніўні 1991 года, была спроба дзяржаўнага перавароту — змова афіцыяльнай улады з ваеннымі і спроба прадухіліць анархію і «навесці парадак» у краіне. Але ў апошні момант Керанскі і яго кабінет адступіліся, а ваенныя дзейнічалі нерашуча, і, практычна без адзінага выстралу, мяцеж быў падаўлены.

Усё гэта вельмі падобна на сучасныя падзеі. Кіраўніцтва нагадвае Керанскага, спачатку — інтанацыямі і моўнымі зваротамі, а чым далей — тым больш тым, што ў спробах утрымацца «ў цэнтры», апіраючыся то на адных, то на другіх, усё больш правісае ў пустаце. Апошнія падзеі знеслі гэты цэнтр на ўзроўні Саюза і пагражаюць знесці ў рэспубліках. Сёння масавая псіхалогія ўсё больш выразна праяўляе схільнасць падтрымліваць не дэманстрацыю сілы, а рэальную сілу і цвёрдасць. Пакуль дэмакраты і кансерватары, «белыя» і «чырвоныя» змагаюцца за ўладу, улада можа трапіць у рукі «карычневых». Па выніках традыцыйнага апытання «Палітыкі года» на першым месцы сёння Назарбаеў, на другім Ельцын і ўжо на трэцім Жырыноўскі (28 працэнтаў апытаных аддалі яму свае галасы).

Надзеі на СНД растайваюць, як ранішні туман. Усе мы адчуваем сябе пасажырамі поезда ў бясконцым тунелі: святло не відаць ні спераду, ні ззаду, а цяжкасці чакання блізкія да крытычнага пункту.

Сёння ўлады не мае ніхто. Але вельмі многія змагаюцца за яе, і гэта нагадвае барацьбу за капітанскі мосцік тонучага карабля, ці за права націснуць «сваю» кнопку ў падаючым ліфце. Людзі зведваюць нястачу ў першую чаргу нават не тавараў, а рэальнай улады ў рэспубліцы, даверу да ўрада, дастойных палітычных лідэраў на ўсіх узроўнях. Каб хоць неяк спрагназіраваць жыццё, усе глядзяць на Расію, таму што ведаюць — у Беларусі будзе копія расійскіх падзей. Глядзяць і суцяшальнага знаходзяць вельмі мала. Прэзідэнт, які павінен кантраляваць урад, сам жа яго і ўзначальвае. Дзяржаўныя служачыя адначасова з'яўляюцца кіраўнікамі эканамічных і камерцыйных структур. Просты чалавек, пакрыўджаны камерцыйным служачым, ідзе ў органы ўлады за абаронай, а яго там сустракае той жа камерсант, на якога скардзяцца, але ўжо ў ролі дзяржаўнай улады — абаронцы радавога грамадзяніна.

Сваёй некампетэнтнасцю «радыкальныя дэмакраты» скампраметавалі дэмакратычныя ідэі, штурхнулі маятнік масавай свядомасці направа, хоць хацелі зрабіць зусім наадварот. Ім трэба было імкнуцца не да ўлады, а, застаючыся ў канструктыўнай апазіцыі, рыхтаваць апору для новай сістэмы адносін, працаваць з масавай свядомасцю, выхоўваць яе. Трэба было фарміраваць масавую псіхалогію цэнтра, г. зн. той пракладкі, якая не дазволіць маятніку адхіліцца ні ў крайняе правае становішча, ні ў крайняе левае, гарантуе грамадству сацыяльны мір.

Гляджу я на ўсё гэта і думаю: менавіта ж гэтым шляхам мы прыйшлі да рэвалюцыі 1917 года. Рэвалюцыі заўсёды незаконныя, але заўсёды заканамерныя. Гэтым жа шляхам мы ішлі і да грамадзянскай вайны. Калі не станем на шлях згоды, цяжка прадказаць вынікі.

Юрый КЛІНЦОЎ,
прыхільнік ідэі стварэння Партыі народнай згоды.

ВОЗГАЛАС

Пра Польска-Беларускі банк, а яшчэ пра крыніцы натхнення...

Можна меркаваць, у бліжэйшы час сярод камерцыйных «дзяцей» Беларускага Нацыянальнага банка з'явіцца яшчэ адно — на гэты раз польска-беларускага паходжання. «У асноўным дамовіліся», — так падрэзюмаваў дырэктар польскага гандлёвага банка Л. Заблоцкі падчас перагавораў у Мінску ў Міністэрстве замежных спраў наконт стварэння Польска-Беларускага камерцыйнага банка. Мэта яго стварэння — паглыбленне эканамічнага супрацоўніцтва, развіццё гандлёвых адносін і прадпрымальніцтва праз інвеставанне капіталаў на нашых тэрыторыях. Асноўны банк будзе ў Варшаве, а ў Беларусі намечана заснаваць самастойнае даччынае аддзяленне. Банкаўскі капітал — у свабодна канверсуемай валюце... Дарэчы, наконт гэтага адзін з беларускіх удзельнікаў зазначыў: «Калгасы створаны, прысылайце калгаснікаў...» Тым не менш можна спадзявацца, што банкаўскі саюз адбудзецца, а ён выцягне на належны ўзровень і эканамічныя ўзаемаадносіны.

А яшчэ ў МЗС парафіравана пагадненне аб дадатковых пагранічных пераходах паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча. У прыватнасці, іх мяркуецца адкрыць толькі для карыстання грамадзянамі абедзвюх рэспублік, прычым не раней, чым у канцы года.

І ў заключэнне гэткі невялічкі нюанс. Журналісты, якіх запрасілі на прэс-канферэнцыю, больш чым гадзіну штурхаліся ў невядомасці перад зачыненымі дзвярамі. Перагаворы, значыць, ішлі, а журналісты побач бавілі час. Набіраліся натхнення...

Некаторыя не дачакаліся. Яно і вядома: у іх таксама час каштуе дорага. І свой пратакол трэба выконваць — перад наведвальнікамі рэдакцый. Прычым строга абавязкова.

Кар. «Звязды».

Народжаная лятаць— лятаць не можа

Цяжкія часы пачаліся для латвійскіх авіятараў. Калі нядаўна народжаная фірма «Латвійскія авіялініі» не вырашыць праблем з палівам, то ёй давядзецца спыніць сваю дзейнасць, бо за ўсе энерганосьбіты прыходзіцца плаціць валютай. Не ўдалася задумка фірмы арганізаваць камерцыйны рэйс да Масквы. Жадаючых набыць білеты за 2 тысячы рублёў, або 15—17 долараў ЗША, знайшлося не вельмі многа.

Камсамольцы ўсіх краін, з'язджайцеся!

МІНСК. (Ю. Дубіна). Беларускія камсамольцы не марнуюць дарма часу: фактычна адрадзіўшыся два месяцы назад, цяпер яны дапамагаюць паўстаць з нябыту сабратам па ідэалогіі. Не без іх удзелу 18—19 красавіка Мэсква стане месцам правядзення XXIII з'езда неіснуючага ВЛКСМ.

Хутчэй! Вышэй! Мацней! Але за 8 капеек

МАГІЛЁЎ. Апошняя сесія гарадскога Савета народных дэпутатаў выдзеліла магілёўскаму спорту ўсяго 8 капеек на чалавека, а толькі на правядзенне спаборніцтваў рознага ўзроўню спорткамітэт просіць у 20 разоў больш. Між тым, спецыялісты падлічылі, што горад забяспечаны спартыўнымі пабудовамі на 49 працэнтаў, у 124 дашкольных установах толькі 16 міні-басейнаў, вучням 42 сярэдніх школ пазлаваць можна толькі ў адной. У гарадскі ж план будаўніцтва спартыўныя аб'екты, ўжо даўно не ўключаюцца. І гэта, нягледзячы на тое, што па выніках 1991 года спартыўная арганізацыя Магілёва заняла трэцяе месца ў гісторыі горада рэальна прэтэндуе на ўдзел у летніх Алімпійскіх гульнях адразу 8 (!) магіляўчан.

МАЛАЙЦЫ, ПРАДАЎЦЫ!

Па ўсім відаць, прадаўцам нашых магазінаў усё больш давядзецца трэніравацца ў... бегу на кароткія дыстанцыі. Інакш можна не ўпільнаваць аматараў пакарыстацца дзяржаўным дабром, а самім заістацца з «носам». Інжынер (!) інстытута «Гіпрасувязь» К., выйшаўшы для храбрасці, зайшоў у мінскі магазін «Дом гандлю», што на праспекту Ф. Скарыны, 74 і адкрыта ўкраў світэр турэцкай вытворчасці, пасля чаго задаў лататы. Але прадаўцы аказаліся спрытнейшымі за рабаўніка з вузаўскім дыпломам: з крыкамі пабеглі за ім і здолелі-такі дагнаць на прыпынку грамадскага транспарту. Малайцы, што і казаць!

ЯК ЛЯЧЫЦЬ ВЕСНАВЫЯ АБВАСТРЭННІ?

Вясной, ды і на пачатку лета ў многіх з нас абвастраюцца хранічныя хваробы. Нястача вітамінаў, аслаблены імунітэт, стомленасць пасля працяглай зімы і зашлакаванасць арганізма — вось асноўныя прычыны веснавых абвастрэнняў. Як з імі змагацца? З рэкамендацыямі старажытнай і сучаснай медыцыны вас знаёмяць фармаколаг Святлана Пятрова і збіральнік народных рэцэптаў Аляксандр Капкоў.

Рэўматызм

Спачатку некалькі старажытных рэцэптаў:

Чарвякі на гарэлцы. Знахары лячылі рэўматызм рознымі спосабамі, у тым ліку і такім экзатычным, як гарэлачная настойка на земляных чарвяках. Іх змяшчалі ў слоік, залівалі гарэлкай, закрывалі накрыўкай і ставілі на сонца на некалькі дзён. Уціралі настойку ў хворыя месцы два разы ў дзень — раніцай і ўвечары.

Рамонак. «Цвет рамоновы травы в вине положен (лепш кіслыя сталовыя сарты) и утре процежен и прият, уймет всякую болесть суставную». У малых дозах такі састаў прымалі ўнутр. Але абгортванні і кампрэсы, як і кампрэсы з разведзенага яблычнага воцату, можуць быць вельмі карысныя.

Лісце, таполі. «Листвие тополево сырое толчено и смешано с уксусом, и тем помазуем камчужную болесть (рэўматызм) и тако болезнь перестанет».

Сучасная фітатэрапія рэкамендуе збор процізапаленчага, агульнаўмацоўваючага і абязбольваючага дзеяння з наступных **лекавых раслін:** карэнішча аеру балотнага (1 ст. лыжка), пупышкі сасны звычайнай (1), трава крываўніку (2), трава хвашчу палявога (2), трава ваўчкоў трохраздзельных (5 ст. лыжак). Ужываць збор трэба так: 2 ст. лыжкі сумесі засыпаць у тэрмас, заліць 0,5 л крутога кіпню і вытрымаць 6—8 гадзін, прымаць па 0,5 шклянкі за 30 хвілін да яды.

Рэкамендацыі для збору і нарыхтоўкі лекавых раслін

Карэнішча аеру (ён расце па берагах рэк, азёр, сажалак і балот) выкопваюць у канцы жніўня — пачатку верасня. Прасушваюць на паветры, разразаюць на кавалачкі даўжынёй 15—20 см і зноў сушаць у памяшканні, якое добра праветрываецца (на гарышчы, напрыклад), пры тэмпературы не вышэй за 25 градусаў.

Сасновыя пупышкі нарыхтоўваюць ранняй вясной ці ў асенне-зімовы перыяд (зразаюць з маладых ссечаных дрэўцаў на ўчастках прарэджвання). Сабраныя пупышкі сушаць на гарышчы ці пад навеццю (але не пад жалезным дахам і не ў сушылках).

Крываўнік лепш збіраць на нізінных лугах, ускрайках палёў каля дарог у ліпені — першай палавіне жніўня, зразаючы верхавіну сцябла даўжынёй да 15 см. Сушаць пад навеццю.

Першыя парасткі **хвашчу** палявога з'яўляюцца ранняй вясной на раллі, сырых лугах, пустках і ў ярах, аднак для лекавых мэт лепш збіраць летнія парасткі. Сушаць на паветры.

Ваўчкі нарыхтоўваюць да і ў пачатку цвіцення, зразаючы верхавіны сцябла, буйное лісце. Сушаць пры 45—50 градусах.

Шмат лекавых уласцівасцей у рускай **бярозы** — здаўна выкарыстоўваліся яе пупышкі, лісце, кара, сок, грыб-чага для лячэння розных хвароб. Пры рэўматызме карыснае маладое лісце, якое збіраюць у маі — чэрвені, калі яно яшчэ не агрубела. Сушаць яго пры 25—30 градусах. Добры эфект даюць ванны з бярозавага лісця, можна таксама рабіць кампрэсы са свежага ці сухога лісця. Папярэдне яго распараваюць, потым кладуць на марлевую павязку і абгортваюць ёю хворыя месцы на 1—2 гадзіны (пакуль павязка не астыне). Рэкамендуем не забываць пра бярозавы сок—яго прымаюць па 1 шклянцы тры разы ў дзень за 30 хвілін да яды.

Карысныя пры рэўматызме павязкі з лісця **падбелу** са **звычайным лопухам.** Свежае лісце расліны здрабняюць на мясарубцы, кладуць на лісце лопуху і абгортваюць хворыя месцы.

Анемія, авітамінозы

Самы просты і вельмі карысны сродак — **морква.** Старажытныя лекары лічылі яе найбольш эфектыўнай з лекавай агародніны. Напрыклад, кітайскія дыетолагі часоў дынастыі Чжоу (II ст. да н. э.) ставілі моркву ў разрад «ахаладжальных» прадуктаў, якія падоўжваюць жыццё. А старажытны расійскі траўнік гаворыць: «Морковь огородная, коим обычаем не буде принята в брашне (ядзе) добрые крови творит и кровь обновляет».

Агульнавядома, наколькі багатая морква правітамінам А (ці каратынам), які ператвараецца ў арганізме ў прысутнасці жывёльных тлушчаў у паўнацэнны вітамін. Менш ведаюць пра складаны эфірны спірт іназіт, што ўваходзіць у састаў каратыноідаў. Пры яго недахвацце церпяць не толькі нервы і страўнікава-кішэчны тракт, але можа быць запаленне скуры і прыкметнае аслабленне зроку.

Пры дэфіцыце ў арганізме нікацінавай кіслаты (вітаміну РР), якой шмат у моркве, чалавек становіцца вялым, узнікаюць галаўныя болі, з'яўляецца шум у вушах, страчваецца пачуццё раўнавагі. Вітамін Е (яго ў моркве ў чатыры разы больш, чым у бураках) каштоўны тым, што дапамагае іншым вітамінам лепш засвойвацца. Адсюль у моркві такое універсальнае і мяккае лячэбнае ўздзеянне на ўвесь арганізм. Багаты гэты смачны караняплод і фоліевай кіслатой, без якой у чалавека развіваецца малакроўе.

А колькі ў ім мінеральных рэчываў!? Магній, які спрыяе выдаленню халестэрыну, расшырае сасуды і зніжае спазмы жоўцевага пузыра і 12-перснай кішкі. Ванадзій, кобальт, бор, ёд і ў першую чаргу цынк актыўна ўдзельнічаюць у крывятварэнні і паляпшаюць функцыю палавых органаў, а ёд — і шчытападобнай залозы. Так што людзям, якія жывуць у раёнах з павышанай радыеактыўнасцю, морква асабліва патрэбна. Тым больш, што дваццацігадовае назіранне амерыканскіх вучоных з Нацыянальнага інстытута ракавых хвароб пацвердзіла адкрытую старажытнымі ўласцівасць моркві процістаяць ракаваму захворванню.

Маркоўны сок (свежы) рэкамендуюць піць да 0,5—1 шклянкі ў дзень. І ні ў якім разе не перабіраць. Лепш прымаць яго раніцай, а ўвечары — салата з цёртай моркві з мёдам і смятанай.

Добра вясновы авітаміноз лечыцца таксама адварамі **шыпшыны, рабіны, парэчак, лясных яблык (дзічкі).** У мінулым былі папулярнымі фруктовыя чаі з прасаваных сухафруктаў, і шкада, што іх культура практычна адышла. Карысна рабіць настой (на пары ў тэрмасе) гэтых ягад (1 ст. лыжка на шклянку кіпню).

А вось рэцэпт з даведніка 17-га стагоддзя «Прахладны вертаград» пра разынкі: «Кто те ягоды часть ест, тот силен телом бывает и добрые крови творит». Дарэчы і з разынак можна адвар рабіць. Карысны таксама ўведзены ў афіцыяльную фармакапею вітамінны чай з сумесі ў роўных частках рабіны і лісця маладой крапівы.

Язва страўніка, энтэракаліты, страўнікава-кішэчныя хваробы

Вось як у старажытнасці выкарыстоўвалі буракі ад энтэракалітаў: «Смешан сок свекольный с семенем крапивы или финиковы травы (кроп) межо толченым и даем пить по рассуждению тем людям, кои недугуют ворчением кишечным». Для гэтага ж прыдатныя адвары сушаных груш, крываўніку, асінавай кары, якія гатуюць з разліку 1 ст. лыжка на шклянку вады. Прымаюць да яды.

Простыя рэцэпты ад абвастрэння язвы страўніка і 12-перснай кішкі

Дзве-тры бульбіны, старанна вымытыя, не абіраючы, націраюць на пластмасавай тарцы. Сок адціскаюць праз некалькі слаёў марлі. Палавіну шклянкі гэтага соку выпіваюць за 20—30 хвілін да яды. І так два разы ўдзень на працягу двух тыдняў. Пасля двухтыднёвага перапынку курс можна паўтарыць.

«Лук.. сырой, толченый с патокой смешан и прият, болезнь всякую из стомаха (страўніка) выведет, коя бывает от мокрости». Гэты рэцэпт каштоўны і тым, што ўказвае на вылячэнне слізістай страўніка. Сумесь гатуецца з разліку 1:1. Прымаецца таксама да яды па 1—2 чайныя лыжкі. Вельмі карысны рэвень (адвар кораня, варэнне з рэвеню, кампоты і г. д.) «Рэвень прият выгонит черную кручину от желчи (желчегонное) и вредительную мокрость, и вычистит стомах (страўнік) и печень, уймет колотье, кое бывает в сердце».

Рэцэпт прымянення рамонку ад страўнікава-кішэчных хвароб

«Цвет толчен и смешан з медом пресным (свежим, не вареным и не бродившим) и прият, легостно пропуск творит и всякую вредительную мокрость, коя бывая в кишках, выгонит».

Пупышкі таполі (можна свежае лісце) — «смола того древа толчена и прията в питии стомах укрепляет и кровавую утробу вяжет». Часцей за ўсё ўжываюць адвар свежага лісця таполі, якое валодае гаючым, слабым вяжучым, процізапаленчым і бактэрыцыдным уздзеяннем. Са смаляністых рэчываў карысная настойка прапалісу, 10—15 кропель на трэць шклянкі вады

Алергічныя абвастрэнні, сенная ліхаманка

Дымедрол, супрасцін і іншыя лякарствы, а тым больш гармоны, якія часова здымаюць алергічныя рэакцыі, зусім не бяскодныя для арганізма. А ці ёсць больш мяккія прыродныя аналагі такіх рэчываў? Канешне, ёсць. Дымедрол замяняюць свежасабраныя, нераспушчаныя шышкі елкі. Здробненыя і высушаныя, іх заварваюць з разліку 1 ст. лыжка на шклянку кіпню. Настой выпіваюць за дзень.

Яшчэ большую ўласцівасць здымаць алергіі мае корань лакрычніку. Гліцырызінавая кіслата і шэраг іншых рэчываў, што ўтрымлівае расліна, валодаюць якасцямі кортыкастэроідных гармонаў, але дзейнічаюць даўжэй і мякчэй. 30 г кораню вараць у 0,5 л вады. Астуджаны і працэджаны састаў прымаюць па 1—2 ст. лыжкі 3—4 разы ўдзень.

Вельмі эфектыўныя супраць сеннай ліхаманкі гамеапатычныя прэпараты ёду, бадзягі, арсеніку, натры сульфурыкуму, сіліцэю і г. д. Звычайна прымаюць па 6—8 шарыкаў пад язык да поўнага рассмоктвання.

«Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае наша дзяцінства»

На карце Таджыкістана больш не існуе Камуністычнага раёна. Па просьбах мясцовых жыхароў Вярхоўны Савет рэспублікі перайменаваў яго ў Газымальскі. Дарэчы, такія пытанні будуць узнікаць перад таджыкскімі дэпутатамі яшчэ неаднойчы, таму што да гэтых дзён існуе Ленінабадская вобласць і Ленінградскі раён, вельмі многія сельскія гаспадаркі носяць імёны партыйных з'ездаў, а адзін з калгасаў — нават імя НКУС. Калі ўлічыць, што яшчэ два гады таму назад у цэнтры Душанбе на дзіцячым садку красаваўся надпіс «Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае наша дзяцінства», то можна ўявіць, якія «перлы» сустракаюцца ў глухіх горных вёсках Таджыкістана.

Думай сам пра сябе

ТАЛАЧЫН (Т. Махтадуй). Дарэмна ў працоўным калектыве раёна з міліцыі ў апошні час накіроўваюцца лісты з патрабаваннямі выхаваўчага ўздзеяння да асоб, якія злоўжываюць спіртнымі напіткамі. На іх мала дзе цяпер рэагуюць. Логіка простая. Сёння кожны павінен сам думаць пра сябе. Гэта за цябе ніхто не будзе рабіць. Правініўся — значыць плаці штраф або пакідай работу з адпаведным запісам у працоўнай кніжцы.

Анекдоты па тэлефоне

БРЭСТ (Ю. Фёдарава). Казкі для дзяцей, а таксама жарты і анекдоты для дарослых хутка будуць рэгулярна перадаваецца ў горадзе па тэлефоне.

У Брэсце пачаў працаваць тэлефонны цэнтр інфармацыі. У памяці камп'ютэраў зялікі аб'ём разнастайных жыццёвых навін. Імі могуць карыстацца і грамадзяне, і прадпрымальнікі: абмен кватэр, продаж і купля тавараў, іншая інфармацыя.

КААПЕРАЦЫЯ І БІЗНЕС

Менавіта так называўся міжнародны навукова-практычны семінар, які днямі праходзіў у Мінску.

Пытанні, якія абмяркоўваліся на ім, сапраўды надзённыя. Само слова «кааперацыя» лічыцца сінонімам лёгкай і несумленнай нажывы. Слухачы, у асноўным прадстаўнікі спажыўкааперацыі суверэнных дзяржаў, былі паінфармаваны наконт таго, як развіваецца кааператыўны рух у свеце. Адзначым, развіваецца добра. У Італіі, напрыклад, кааператывы кантралююць 20 працэнтаў будаўнічага рынку, у Бельгіі — 10 працэнтаў аптэчнага і г. д. Ўвогуле ж у краінах Еўрапейскай эканамічнай супольнасці зараз налічваецца 36 тысяч кааператываў.

Старшыня Саюза прадпрымальнікаў Беларусі У. Карагін паведаміў, што міжнародныя рэкамендацыі па арганізацыі кааператываў у той ці іншай галіне складаюць амаль 200 тамоў(!).

Мы ж можам канстатаваць адно: кааператарам у нашай рэспубліцы жывецца не намнога лепш, чым іншым членам грамадства. Пакуль у гасцініцы ішоў семінар, тысячы жадаючых аб'яднацца дзеля вытворчасці ці спажывання пакутавалі не столькі ад таго, што ім перашкаджае ўрад, колькі таму, што ў рэспубліцы няма структуры, здольнай зацікаўлена дапамагчы пачынаючым. Звыш пяці тысяч каштуе «паслуга» Саюза малых прадпрыемстваў па складанню статута, не менш бяруць з пачынаючых і за выраб пячаткі, а каб засведчыць натарыяльна копіі дакументаў, даводзіцца займаць чаргу «ў некалькі тыдняў». Мяркую, каб Саюз прадпрымальнікаў вырашыў выдаць не дзве сотні тамоў міжнародных рэкамендацый, а толькі два, то таксама браў бы за гэту паслугу значную суму. Вось і атрымліваецца, што пакуль адны працуюць і шукаюць, другія на іх робяць грошы, а трэція—развіваюць ідэі навуковага кааператывізму. Дык як жа тут стаць на ногі цывілізаванаму кааператару?

Віктар ХУРСІК.

РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ «СВАБОДА»

*** Старшыня Вярхоўнага Савета Расіі Руслан Хасбулатаў ахарактарызаваў рэарганізаваны Барысам Ельцыным урад як некампетэнтны. Услед за адстаўкамі з пастоў віцэ-прэм'ера, міністра фінансаў і першага віцэ - прэм'ера Сяргея Шахрая, Ягора Гайдара і Генадзя Бурбуліса, Ельцын у суботу зрабіў яшчэ шэраг перастановак ва ўрадзе, пазбавіўшы міністэрскіх партфеляў некаторых іншых вядучых палітыкаў. Прэзідэнт Расіі зрабіў перамены напярэдадні з'езда народных дэпутатаў краіны, на якім, як мяркуецца, ягоная праграма эканамічных рэформ падвергнецца рэзкай крытыцы. Хасбулатаў жа сказаў, што неабходны структурныя рэформы, а новыя людзі Ельцына не маюць паняцця, што такое сельская гаспадарка і прамысловасць.**

*** У суботу ў Ніжнім Ноўгарадзе з аўкцыёна прададзены 22 мясцовыя дзяржаўныя прадпрыемствы. Пачата такім чынам рэалізацыя гарадской праграмы прыватызацыі, у рамках якой на працягу паўгода мяркуецца прадаць каля дзвюх тысяч прадпрыемстваў. Па словах віцэ-прэм'ера Расіі Ягора Гайдара, аўкцыён у Ніжнім Ноўгарадзе можа служыць узорам. Аднак самога Гайдара ў горадзе сустрэў натоўп прыкладна з 300 чалавек, які пратэставаў супраць прыватызацыі. Цэны на ніжагародскім аўкцыёне вагаліся ад 55 тысяч рублёў за пустое памяшканне да 10 мільёнаў за магазін крышталянага і шкляного посуду.**

*** Прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук абвінаваціў кіраўніцтва Расіі ў спробе запалохаць Украіну. Пры гэтым ён заявіў, што прыме адпаведныя меры з тым, каб супрацьстаяць любой спробе Расіі прысвоіць Чарнаморскі флот. Краўчук падкрэсліў, што спробы запалохаць Украіну неразумныя і бясплодныя. Прэзідэнт Украіны выступіў з гэтай заявай у адказ на выказванне прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына аб тым, што Расія возьме пад свой кантроль увесь Чарнаморскі флот, калі Украіна будзе прэтэндаваць на непамерна вялікую частку яго. А ў ходзе свайго візіту ў Севастопаль віцэ - прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Аляксандр Руцкой заявіў, што Расія ніколі не адмовіцца ад гэтага флоту. Па словах Руцкога, Чарнаморскі флот заўсёды будзе хадзіць пад рускім флагам і абараняць пры гэтым усю Садружнасць Незалежных Дзяржаў.**

***** Перамовы паміж кіраўніцтвам Малдовы і Прыднястроўскай Рэспублікі закончыліся безвынікова. Бакі абвінавацілі адзін аднаго ў правале іх. Кіраўніцтва Прыднястроўя прапанавала перадаць горад Бендэры пад кантроль войск СНД, аднак прэм'ер-міністр Малдовы Валерыу Мураўскі адвергнуў гэту прапанову.

*** Прэзідэнт Босніі і Герцагавіны аб'явіў у рэспубліцы ўсеагульную мабілізацыю. У адпаведнасці з прэзідэнцкім указам, гарадскія ўлады ў рэспубліцы могуць прызываць на вайсковую службу ўсіх мужчын, здольных насіць зброю, і накіроўваць іх у атрады рэспубліканскіх сіл, паліцыі і грамадзянскай абароны.**

***** Кіраўнік Кубы Фідэль Кастра заявіў, што Куба не пагражае страх, падобны таму, што напаткаў Савецкі Саюз. Паводле ягоных слоў, кубінцы хутчэй памруць, чым прымуць капіталізм. Выступаючы перад маладымі камуністамі ў Гаване, Кастра сказаў, што Куба зусім не разбурана, а каб заваяваць яе, ворагам давядзецца ісці па трупах. Заклікаўшы маладых камуністаў захоўваць вернасць камуністычнай ідэалогіі, лідэр Кубы аб'явіў, што сацыялізму ў СССР не проста прыйшоў канец, а ён, паводле слоў Кастра, быў па-зладзейску забіты ў змове, арганізаванай імперыялістамі пры дапамозе знутры. Савецкі сацыялізм, падкрэсліў Фідэль, загінуў ад удару нажом у спіну.

«БІ-БІ-СІ»

*** Міністр замежных спраў Ізраіля Дэвід Леві паведаміў аб перагаворах свайго рашэння адносна адстаўкі з займаемай пасады. Леві і прэм'ер-міністр Ізраіля Іцхак Шамір заявілі аб дасягнутым паміж імі ўзаемаразуменні.**

***** У гарадах Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, населеных чорнымі, у апошнія некалькі дзён загінулі 36 чалавек. Гэта паследавала пасля забойства напярэдадні 20 чалавек у адным з паселішчаў пад Йаханесбургам.

*** У Харватыі пачалося размяшчэнне французскага кантынгента міратворчых сіл Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У складзе кантынгента—1300 вайскоўцаў.**

***** Ваеннае камандаванне Ізраіля адмяніла камендантскую гадзіну ў сектары Газа, дзе жывуць звыш 120 тысяч палесцінцаў.

*** Урад Малдовы гнеўна адрэагаваў на візіт віцэ-прэзідэнта Расіі Аляксандра Руцкога ў Прыднястроўе. Гэты візіт расцэньваецца як грубае ўмяшанне ва ўнутраныя справы Малдовы. Ва ўрадавай заяве гаворыцца, што Малдова разглядае візіт як падтрымку з боку Расіі сепаратыстаў Прыднястроўя. Стала вядома таксама, што расхватараваныя ў Малдове войскі СНД пачалі ўстанаўленне лініі спынення агню паміж сіламі бяспекі Малдовы і сепаратыстамі. Улады Малдовы патрабуюць вываду войск СНД, бо, на іх думку, кантралюемыя з Масквы войскі не могуць быць непрадузятымі ў гэтым канфлікце.**

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

***** Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Бутрас Галі заклікаў Савет Бяспекі неадкладна накіраваць у Югаславію ўсе 14 тысяч салдат войск ААН па падтрыманню міру. Галі ўказаў на абвастрэнне там ваеннай і палітычнай абстаноўкі.

*** Расійскі прэзідэнт Барыс Ельцын выказаўся за ўстанаўленне ў Расійскай Федэрацыі прэзідэнцкай дэмакратыі. Парламенцкая дэмакратыя без дакладна ўстаноўленай сістэмы партый не мае сэнсу, сказаў Ельцын ў прамове, выступаючы перад членамі дэмакратычных партый і арганізацый у Маскве.**

***** Прэзідэнт Таджыкістана Рахман Набіеў заклікаў пакончыць з антыўрадавымі дэманстрацыямі, якія праходзяць у Душанбе. У сталіцы вось ужо два тыдні праходзяць арганізаваныя апазіцыяй мітынгі, удзельнікі якіх патрабуюць адстаўкі ўрада.

*** Прэм'ер - міністр Азербайджана Гасан Гасанаў падаў у адстаўку. Новым кіраўніком урада назначаны былы намеснік прэм'ер-міністра Мустафаеў. Гэта — вынік працяглай барацьбы за ўладу паміж выконваючым абавязкі прэзідэнта Якубам Мамедавым і Народным фронтам Азербайджана.**

КАРМІЛЬЦЫ

На Брэстчыну прыйшло добрае, сонечнае надвор'е. У высокім блакітным небе плывуць журавы. Як і кожны год, у гэтыя красавіцкія дні яны бачаць людзей у бясконцых веснавых клопатах. Тут не мітынгуюць і не бастуюць. Хлебаробы калектыўнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Астрамечава» працуюць да позняга вечара. Яны добра разумеюць сваю галоўную задачу: хутка і якасна завяршыць сяўбу. Гэта адказная справа вядзецца тут на высокім агратэхнічным узроўні.

На здымках: браты Сяргей і Віктар **Гопты** сталі добрымі механізатарамі; у працаўнікоў гаспадаркі няма прэтэнзій да работніц сталовай Волы **Грачка**, Таццяны **Міхед** і Ганны **Раманоўскай.**

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ

«ПАРАДАК—НЕ ДЫКТАТУРА, А РАСКЛАД РУХУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

— Але хіба можна зараней спраграмаваць безліч сітуацый?

— Усё вырашаецца вельмі проста. У нас адсутнічае закон аб дзяржаўнай службе. Ён павінен рэгламентаваць удзел кіраўнікоў у камерцыйных структурах, у малым бізнесе і г. д. Усё стане на свае месцы. А мы зацягваем прыняцце такіх законаў, ствараем цэлую эпоху безуладдзя, якую вельмі ўмела выкарыстоўваюць спрытныя людзі. Вазьміце пытанне з зямлёй. Практычна няма кіраўніка, які б не надзяліў сябе ўтульным куточкам непадалёк ад горада, не адбудаваў (ці будуе) там цёплае гняздзечка. Быццам бы нікому не забараняецца рабіць гэтага, але ці атрымаецца ў кожнага? Мы да гэтага часу не распрацавалі механізм карыстання зямлёй, платы за яе. У Маладзечна склалася вельмі напружанае становішча з жыллём. Чаму той, хто гадамі стаіць у чарзе, не можа без перашкод, бясплатна атрымаць кавалак зямлі, каб будаваць сабе дом — у той час, як загарадныя рэзідэнцыі будуюць тыя, хто даўно мае жыллё ў горадзе? Чаму не даць людзям роўныя шанцы — не на словах, а на справе? Мы расцягваем гэтую паласу неразбярыхі, тым самым зацягваючы пятлю на шыі грамадства.

Калі мы думаем сур'ёзна працаваць, калі «рынак» — не проста моднае слова, а мэта, то мы мусім «выштурхнуць» найперш тыя законы, рашэнні, якія рэгламентуюць правы ўладных структур. Гэта павінны быць заканадаўчыя акты, якія патрабуюць вельмі сур'ёзнай адказнасці. Такой і бачыцца простая схема парадку: граматныя, недвухсэнсоўныя законы, дзе чотка пазначаны правы і абавязкі — і адказнасць за іх парушэнне. Ніякімі перастаноўкамі і рэарганізацыямі гэту работу не заменіш.

— Але вы — член Прэзідыума ВС, старшыня пастаяннай камісіі...

— Адказнасць з сябе не здымаю, і на першым часе спрабаваў вельмі актыўна ўмешвацца ў падзеі, аднак пераканаўся ў безвыніковасці гэтага занятку: калі няма стрыжня, чоткай і пэўнай праграмы, канцэпцыі, цяжка дастасоўваць часткі. Таму, відаць, і дэпутаты ўсё актыўней пацягнуліся да работы ў выканаўчых структурах, што таксама губіць справу.

— У тым ліку і вы.

— І я таксама. Тут, у ВС, працаваць было б прасцей, спакайней. Але без чоткай нацэленасці на вынікі. Не прывык ствараць бачнасць работы. У Маладзечна яна — цяжкая, але канкрэтная.

— Але, магчыма, у асноўную заслугу парламента, яго лідэра варта ўсё ж паставіць здольнасць захоўваць у рэспубліцы стабільную палітычную сітуацыю, вернасць ідэі згоды?

— Згода без канкрэтнай мэты — скачкі то ў адзін бок, то ў другі, у выніку — зыходнае становішча, таптанне на месцы. Шушкевіч — лідэр большасці, умее адчуваць перамены настрою гэтай большасці, і ў залежнасці ад гэтага карэкціраваць погляды. У час напружанай палітычнай барацьбы, якая не сціхае і ў парламенце, такі чалавек зручны для ўсіх, бо не мае, як часта паўтарае, сваёй каманды, сваіх пэўна акрэсленых сімпатый. Па-мойму, гэта не вельмі станоўчая ў сённяшняй сітуацыі якасць, якая вядзе да аморфнасці палітыкі.

— У такім разе як вы адносіцеся да ідэі рэферэндума?

— Нічога не маю супраць рэферэндума, — калі мы прымалі адпаведны закон, то хто ж можа забараніць рэферэндум? Але што будзе далей — вось што мяне хвалюе. Калі новыя людзі, што прыйдуць да ўлады, паставяць за мэту неадкладнае прыняцце новай Канстытуцыі, дзе чотка і бездакорна будзе рэгламентавана ўся ўладная структура — станавы хрыбет любой дзяржавы — падтрымліваю. Калі ж уладныя вышыні патрэбны толькі для таго, каб зрабіць чарговыя перастаноўкі крэслаў — будзем мець сумны вынік. Гарантый ад апошняга ў мяне пакуль няма.

Гутарку вяла Людміла РЫЖАНКОВА.

Гордан БРУК-ШЭПЕРД

ЛЕС перАбежчыКА

Дакументальны расказ пра жыццёвы шлях савецкага разведчыка, які пачаўся ў Бабруйску, а закончыўся ў Кліўлендзе.

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 65—70).

Такую ж сур'ёзную ўвагу Сталін удзяліў пуску ў абарачэнне гэтых фальшывак, якія былі надрукаваны ў выглядзе буйных (стодоларавых) купюр. Для гэтага прыйшлося спецыяльна набыць — праз пасрэдніцтва канадскіх камуністаў — берлінскую фінансавую кантору «Заз-Марціні».

Нягледзячы на такую грунтоўную падрыхтоўку, аперацыя правалілася. У той час газеты пісалі, што банда фальшываманетчыкаў збіралася распаўсюдзіць падробленыя банкноты на суму ў два мільёны долараў. Сапраўдныя апетыты Сталіна былі куды больш грандыёзныя. Арлоў паведаміў, што ў Злучаных Штатах меркавалася пусціць у абарачэнне фальшывак на дзесяць мільёнаў, ды і то ў якасці «першага этапа» ўсяго мерапрыемства.

Гэта інфармацыя ўсхвалявала амерыканскіх кангрэсменаў непараўнальна мацней, чым усе перыпетыі палявання за Троцкім, аб якіх паведаміў Арлоў. Яшчэ больш уразілі звесткі, выдадзеныя Арловым «пад заслону» — у самым канцы слуханняў —і выклікаўшыя бурны абмен думкамі. Яны датычылі сеткі шпіянажу, якую Крэмль змог раскінуць у Злучаных Штатах яшчэ перад другой сусветнай вайной.

Арлоў падкрэсліў, што к 1938 году савецкія верхаводы ў сваіх планах шпіёнскай і падрыўной дзейнасці ўдзялялі ЗША такую ж увагу, як Англіі і Францыі. Гэта праяўлялася хоць бы ў тым, што, калі прымаць пад увагу толькі агентуру, падначаленую НКУС (гэта значыць без ваеннай разведкі, якая знаходзілася ў падпарадкаванні ГРУ — Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Чырвонай Арміі) і прытым толькі «легальную», гэта значыць тых агентаў, якія працавалі пад прыкрыццём сваіх афіцыяльных пасад у дыпламатычных і гандлёвых місіях, то ў Злучаных Штатах налічвалася прынамсі васемнаццаць гнёздаў савецкага шпіянажу. На чале гэтай сеткі стаяў нейкі таварыш Гусеў, які калісьці быў у падначаленні Арлова. Цяпер у распараджэнні Гусева былі шэсць савецкіх разведчыкаў у розных канцах Злучаных Штатаў, кожны з якіх меў трох памочнікаў-амерыканцаў. Як правіла, гэта былі члены амерыканскай кампартыі.

Вядома, цяпер, праз два дзесяткі гадоў, уся гэта інфармацыя аб пранікненні савецкай агентуры ў ЗША мела хутчэй гістарычнае значэнне, але каб Арлоў даў свае паказанні адразу пасля прыбыцця ў Злучаныя Штаты і каб, да таго ж, яны атрымалі належную ацэнку, то, верагодна, не было б цяжкасці пераканаць прэзідэнта Рузвельта развітацца са сваімі ілюзіямі ў адносінах да Савецкага Саюза і яго «мужнага і цвярозага лідэра — дзядзькі Джо», якога не ў меру дабрадушныя дзяржаўныя дзеячы Амерыкі палічылі зусім падыходзячым партнёрам пры вырашэнні пасляваеннага лёсу свету.

У 1963 годзе выдавецтва Мічыганскага універсітэта выпусціла кнігу Арлова пад сухой назвай «Дапаможнік па разведвальных і партызанскіх аперацыях». Сам ён ахарактарызаваў яе як скарочаны і перапрацаваны варыянт кіраўніцтва, складзенага ім у 1935—1936 гадах для савецкіх сакрэтных школ па падрыхтоўцы дыверсантаў і тэрарыстаў.

Напісаўшы гэту кнігу, Арлоў часова перастаў займацца літаратурнай дзейнасцю і ўзяўся за вывучэнне савецкага заканадаўства — яно цікавіла яго яшчэ з тых даўніх часоў, калі яму давялося служыць у Вярхоўным судзе... Але бесклапотнае жыццё старэючых мужа і жонкі нечакана парушыла падзея, якую цяпер, праз паўтара дзесятка гадоў пасля смерці Сталіна, яны лічылі зусім неверагоднай. Як высветлілася, Крэмль зусім не забыўся аб існаванні Аляксандра Арлова і, больш таго, ведаў, што ён жыве цяпер у гарадку Ан-Арбор штата Мічыган.

14 лістапада 1969 года, у другой палавіне дня, у дзверы кватэры Арловых далікатна пастукалі. Арлоў асцярожна прыадчыніў дзверы, прытрымліваючы рукой ланцужок: яго крыху збянтэжыла тая акалічнасць, што знізу, з пад'езда, яму перад гэтым ніхто не пазваніў, папярэджваючы аб прыходзе гасцей. На лесвічнай пляцоўцы стаяла нейкая незнаёмая фігура.

Відаць, не здагадваючыся, хто выглядвае з-за дзвярэй, але ў той жа час, несумненна, добра ведаючы, хто жыве ў гэтай кватэры, чалавек працягнуў пакет, тлумачачы па-англійску, што гэта пісьмо ад аднаго з таварышаў Арлова па Іспаніі, і застыў у чаканні адказу. Арлоў узяў пісьмо і, не збіраючыся здымаць з дзвярэй ланцужок, спытаў, з кім мае справу.

— Маё прозвішча Феакцістаў, — пачуў адказ. — Я хацеў бы сказаць некалькі слоў Аляксандру Міхайлавічу...

Арлоў зразумеў, што незнаёмец або не пазнаў яго, або наогул не мае ўяўлення, з кім гаворыць. Таму ён папрасіў госця пачакаць: «Зараз я перадам пісьмо Арлову...» Але такі абарот справы не спадабаўся Марыі. Нездарма, відаць, амерыканскія чыноўнікі называлі яе «афіцэрам бяспекі, адказным за ўсю сям'ю!» Пачуўшы са свайго пакоя гэту размову, яна выйшла да дзвярэй кватэры і запатрабавала, каб невядомы прад'явіў пасведчанне асобы. Той паўтарыў, што яго прозвішча Феакцістаў, дадаўшы, што ён член савецкай дэлегацыі ў ААН, працуе, такім чынам, у Нью-Йорку, а ў пацвярджэнне сваіх слоў выцягнуў нейкае пасведчанне. «У вас ёсць пры сабе рэвальвер?» — пацікавілася Марыя, і Феакцістаў запэўніў яе, што няма.

Зачыніўшы дзверы, якія вялі з прыхожай у пакоі, Марыя завязала з ім доўгую размову. Не было сумнення, што Феакцістаў — супрацоўнік савецкай дзяржбяспекі, які прыкрываецца легальнай пасадай «члена савецкай дэлегацыі ў ААН».

Ведаючы, што жонка дзейнічае ў іх агульных інтарэсах, Арлоў прыслухоўваўся да размовы, не паказваючыся больш у прыхожай. Размова, пачатая Марыяй, у асноўным была аб лёсе яе сясцёр, якія жылі ў Савецкім Саюзе. Можа, пытаўся Феакцістаў, яе цікавяць якія-небудзь звесткі аб іх? Ён мог бы перадаць ім яе адрас. Ці не захоча яна пераслаць ім вестку аб сабе? Але як толькі Феакцістаў, яўна кіруючыся атрыманымі інструкцыямі, спрабаваў закрануць сямейныя справы Арловых, Марыя адразу ўхілялася і пачынала гаварыць аб савецкай палітыцы ў цэлым — аб прадмеце, дастаткова добра ёй вядомым. Калі канчаткова стала ясна, што да Арлова яго не дапусцяць, незнаёмец пайшоў. Арловы зразумелі, што цяпер іх не пакінуць у спакоі.

Сапраўды, хутка пачуўся тэлефонны званок. У якасці новай тактыкі Феакцістаў выбраў ліслівасць, якая, як ён спадзяваўся, павінна была падзейнічаць безадмоўна: у Савецкім Саюзе, бачыце, усе аддаюць належнае аўтару «Тайнай гісторыі сталінскіх злачынстваў», больш таго, захапляюцца ім. Час цяпер зусім іншы, не тое, што пры Сталіне, і ўжо даўно ніхто не лічыць яго ворагам народа. Сам Феакцістаў быў бы проста шчаслівы атрымаць ад генерала Арлова экземпляр яго вядомай кнігі.

Карыстаючыся заступніцтвам амерыканскіх спецслужбаў, якія цяпер па-сапраўднаму спачувалі Арлову і лічылі сябе яму ў многім абавязанымі, муж і жонка спешна перабраліся назад у Кліўленд. КДБ спатрэбілася паўтара года, каб зноў натрапіць на іх след.

Раніцай 10 жніўня 1971 года пачуўся знаёмы далікатны стук у дзверы. Марыя не адразу пазнала нечаканага наведвальніка. Але той адразу прад'явіў ёй свой дыпламатычны пашпарт і спакойна папрасіў дазволу ўвайсці ў прыхожую, «каб вы маглі пераканацца, што гэта я...»

Нясмелыя манеры Феакцістава і яго не зусім зразумелая настойлівасць хоць каго маглі ўвесці ў зман... Марыі прыйшло ў галаву: а што, калі ён таксама сыты па горла савецкімі парадкамі і хоча, каб яму пасадзейнічалі ў атрыманні прыстанішча на Захадзе? Чаму і не? Яна паклікала мужа і са зразумелым хваляваннем задала госцю пытанне:

— Вы што, разышліся з савецкім рэжымам?

— Я, уласна, не разышоўся, — адказаў той. — Я працую на іх...

Пасля гэтага размова прыняла характар, які нагадваў гутарку праз дзверы ў Ан-Арборы. Феакцістаў працягваў сцвярджаць, што савецкі ўрад і народ пранікаюцца да таварыша Арлова ўсё большай павагай. Ён карыстаецца там такой любоўю, што варта толькі каму-небудзь падаць ураду гэту думку — і яго неадкладна зробяць Героем Савецкага Саюза. Не ведаюць толькі, як паставіцца да гэтага сам Арлоў, «і гэта многіх спыняе». Што ж датычыцца сённяшняга візіту, то адзіная яго мэта — атрымаць дазвол генерала на публікацыю ў СССР кніг, прысвечаных яму, і ў першую чаргу яго ўласнага антысталінскага твора.

І наогул, чаму б генералу не вярнуцца цяпер разам з жонкай на радзіму, дзе яго чакаюць слава і пашана? І ці не жадае Арлоў перадаць прывітанне каму-небудзь са сваіх старых сяброў у СССР — ім, напэўна, гэта будзе прыемна.

А пакуль што — ці не спусціцца ён на хвілінку ўніз, каб Феакцістаў мог пазнаёміць яго са сваёй жонкай і дачкой? Яны чакаюць ля пад'езда ў машыне...

Гэта быў, безумоўна, няўдалы ход. Арлоў цудоўна ведаў, што ў Маскве яго чакае куля, а не зорка Героя. Не было ў яго таксама сумненняў, што ў машыне, якая стаяла ля пад'езда, сядзяць не жонка і дачка бяскрыўднага супрацоўніка ААН, а спецыяльна абучаныя забойцы ці выкрадальнікі.

Расказваючы пра гэты эпізод сябрам, Арлоў заўважыў, што ўсё ж ён даведаўся ад Феакцістава пра адну важную для яго рэч. Ці то выпадкова, ці наўмысна Феакцістаў раптам сказаў, вяртаючыся да таго даўняга ўчынку Арлова:

— А вы ведаеце, мне давялося бачыць тое пісьмо, што вы напісалі Сталіну! Я нават прачытаў, якую ён там наклаў рэзалюцыю...

Рэзалюцыя аказалася ў сталінскім стылі — вельмі нецэнзурнай. Але менавіта такая рэакцыя правадыра сведчыла, што гэта была бяссільная злость. Такім чынам, той шантаж аказаўся дзейсным, спрацаваў і дасягнуў мэты: выратаваў яго блізкіх, якія засталіся ў СССР.

Феакцістаў быў, зразумела, выстаўлены за дзверы, і яму прапанавалі наогул забыць дарогу да гэтага дома. Больш ён не з'яўляўся. Але яго місія, хоць і безвыніковая, мела, аднак, ракавое пабочнае дзеянне. Хваляванне за мужа, перажыванні, звязаныя з гэтым візітам і чаканнем далейшых непрыемнасцей, заўчасна звялі жонку Арлова ў магілу. 16 лістапада 1971 года Марыя памерла ад сардэчнага прыступу.

Муж перажыў яе на год і чатыры месяцы. У гэты апошні перыяд свайго жыцця ён зноў працаваў над мемуарамі, якія па сённяшні дзень не дачакаліся выдаўца, і адначасова яшчэ раз рэдагаваў рускамоўны рукапіс «Тайнай гісторыі...» 7 красавіка 1973 года ён памёр у кліўлендскай бальніцы св. Вінсента ва ўзросце сямідзесяці сямі гадоў.

Пераклад з англійскай І. КАСІНСКАГА і А. СКАРАПІСЦАВАЙ («Иностранная литература»).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

7 красавіка

Беларускае тэлебачанне

16.30. Беларуская літаратура. II клас.
17.00. «Маўглі». 4-я і 5-я серыі. «Блакітная страла». Мультфільмы.
18.00. «Мужчынскія рамёствы». Дак. фільм.
18.55. Дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый. «Тэхналогія страху».
19.40. Эканамічная хваля. Банк за аблігацыі грошай не дае. Прамая лінія. У перапынку (20.25) — Калыханка.
21.00. Тэлебіржа.
21.15. Прафсаюзы: праблемы, каментары.
21.35. Арыі з італьянскіх опер і неапалітанскія песні выконвае Міхаіл Галкоўскі.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Рытмічная гімнастыка.
11.55. Інстытут чалавека.
12.35. Фермата.
13.00. Дак. фільм «Невядомае золата».
14.00. Навіны.
14.25. «Аб спорце і не толькі». Уладзімір Зельдзін.
14.45. «Пра цябе». Маст. фільм.
16.10. Дзіцячы музычны клуб.
17.00. Навіны.
17.25. Дасье
17.55. Мультфільмы.
18.15. Хакей. Чэмпіянат СНД. Фінал. «Дынама» (Масква) — ЦСКА. У перапынку (18.50) — Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Уікэнд за мільён».
21.55. Фермата.
22.20. Мастацка - публіцыстычны фільм «Рэформа на крыві». Частка 3-я.
23.00. Навіны.
23.25. Лімпапо.
23.55. «Гукавая дарожка». ТБ-версія.
00.25. «Пра цябе». Маст. фільм.

Канал «Расія»

11.20. «Там, дзе неба ляжыць на зямлі». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Цяжкі ўзрост. «Арт-зона».
15.30. Прастора плюс.
16.00. Дзённік з'езда.
16.15. «Свята Поўначы».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Дзень добры, Святлана Іграўная» (Самара).
17.40. Вольны час. «Увага: здымаю!»
18.00. «Санта-Барбара». 32-я серыя.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. На пытанні Андрэя Каравулава адказвае мітрапаліт Валакаламскі і Юр'еўскі Піцірым.
20.25. «Сны пра Ізраіль». Фільм 5-ы. «Невядомы Ізраіль».
21.15. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
22.00. Весткі.
22.25. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.

8 красавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Веснавы турнір». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 11 клас.
9.30. Тэлепраграма «Вёсачка».
10.05. «Берег». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
16.30. Экран дзіцячага фільма. «Шэраманец».
18.00. Дэбюты. Саюз кампазітараў Беларусі прадстаўляе...
18.55. Дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. «Сябры старыя і новыя».
19.40. Калыханка.
20.00. Хакей. «Дынама» (Мінск) — «Дызеліст» (Пенза).
20.45. Метраном. «Хто выратуе нашы душы?» Музычна - публіцыстычная праграма. Прамая лінія.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
23.30. НІКа.

І канал. Астанкіна

7.35. «Пека». Мультфільм.
7.45. Дзіцячы музычны клуб.
8.35. Маст. фільм «Сакрат». 1-я серыя.
9.40. Хакей. Чэмпіянат СНД. Фінал. «Дынама» (Масква) — ЦСКА.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. «Галасы гор». Дак. фільм.
11.45. Пад знакам «П».
12.35. Мультфільм.
12.55. Як дабіцца поспеху?
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. «Сёння і тады».
14.55. «Айя». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.00. Дыяна Рос. «Працуючы на знос».
17.00. Навіны.
17.25. Хранікальна - дакументальны фільм «Суд гонару».
18.15. Мультфільм.
18.40. Маст. фільм «Сакрат». 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.45. Хіт-парад «Астанкіна». Песні года.
22.20. Мастацка - публіцыстычны фільм «Рэформа на крыві». Частка 4-я.
23.00. Навіны.
23.25. Музычны прагноз.
23.50. Футбол. На шляху да Уэмблі.
0.50. «Айя». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.20. Дакументальная панарама. «Чукокала».
8.00. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
8.30. Вольны час. «Увага: здымаю!»
8.45. Тэлетэатр. «Уцекачы».
10.50. Цяжкі ўзрост. «Арт-зона».
11.20. Нетрадыцыйная медыцына. У перадачы ўдзельнічае А. Чуман.
12.00. «Як хаваюць у Адэсе». Маст. фільм.
12.10. Іграе ансамбль «Малады джаз».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. «Канверсія». Магчымасці Урала.
15.30. «Дзяржава і асоба».
16.00. Дзённік з'езда.
16.15. Хрысціянская праграма. «Загінуўшы свет».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Далёкі Усход».
17.45. «Вольны час. «Дай лапу, сябар!»
18.00. Чэмпіянат Расіі па футболу. «Лакаматыў» (Н. Ноўгарад) — «Спартак» (Масква).
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. «Ноч». Мультфільм.
19.50. «Любы, дарагі, каханы, адзіны...». Маст. фільм.
21.00. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
22.00. Весткі.
22.25. На З'ездзе народных дэпутатаў Расіі.
23.30. Маленькія музычныя вечары. «Дзень нараджэння Расіі».

РОЗДУМ ПАСЛЯ СУДА

СТАЛІ МАМЫ ЛІШНІМІ

Чаму забіваюць адзін аднаго блізкія людзі і сваякі

Вадзіцель станцыі «хуткай дапамогі» Яўген Ганчарэнка гнаў машыну на ўсю скорасць. Выклік ішоў яго: нейкая бяда здарылася са Святланай, былой жонкай. Трэба спяшацца: можа, яшчэ і ўдасца ўратаваць яе. Але як толькі ён разам з дзяжурным урачом пераступіў парог кватэры, стала зразумела: усё, тут нават і сам Бог не дапаможа. Гэта было відаць і па вялізнай лужыне крыві, у якой ляжала Святлана, і па адчайнаму плачу сына і дачкі. Асабліва заходзіўся ў слязах Вадзім. Раз-пораз паўтараючы: «Хто, хто гэта мог зрабіць?», ён мацаў пульс на руцэ маці, заглядваў у шафу і на балкон, дзе маглі застацца сляды забойцы, папракаў сястру Марыну, што яе не было дома.

Праз некалькі гадзін судова-медыцынская экспертыза ўстанавіла, што 40-гадовая настаўніца Калодніцкай сярэдняй школы Калінкавіцкага раёна Святлана Уладзіміраўна Ганчарэнка памёрла ад сукупнасці ран галавы, шыі, твару, грудной клеткі, жывата, плячэй, рук і ног. Усяго іх на целе загінуўшай жанчыны было 83. Жыхары райцэнтра розуму не дабіралі, каго так моцна «дапяклася» жанчына, што з ёй абышліся з такой нечалавечай жорсткасцю, і ніхто не мог даць веры, што гэта справа рук яе сына. Да таго часу, пакуль Вадзім сам аб усім не расказаў на судзе.

Так, сваю маці ён неўзлюбіў з дзяцінства, калі яна скасавала з бацькам шлюб. Пасля таго яна нярэдка прыводзіла дадому мужчын, з якімі наладжвала выпіўкі, а яго з Марыяй праганяла. Ён не мог спакойна слухаць яе натацый: чому не ўладкоўваецца, вярнуўшыся з арміі, на работу, чаму, глынуўшы некалькі кілішкаў спіртнога, сеў за руль бацькавай легкавушкі і разбіў яе. А ці можна было цярпець яе кпіны з прычыны таго, што яго нявеста Эдзіта сама прыходзіць да іх у дом? Вось і даводзілася іншы раз «павучаць» маці. Як? У 1990 годзе тры разы біў яе, адзін раз агрэўшы табурэткай.

— Крыўда, якая накоплівалася гадамі, і абразы, якімі мяне маці асыпала, і прывялі да трагічнага здарэння, — канстатаваў на судзе Вадзім. — І ў той дзень, калі яна, выпіўшы самагонкі са сваёй сяброўкай, зноў пачала папракаць мяне, я страціў кантроль над сабой. Кухонным нажом, які зламаўся, забіў яе. А сам вымыўся ў ванне, пераапрануўся і пайшоў з дому, вярнуўшыся туды пасля Марыны.

Самае страшнае ў гэтай гісторыі тое, што, забіваючы самага роднага чалавека, які даў яму жыццё, выкарміў, паклаў нямала сіл на выхаванне (хаця маці і мела пэўныя чалавечыя недахопы і слабасці — а ў каго з нас іх няма?!), Вадзім быў абсалютна дзвярозы. І план забойства прадумаў загадзя. Выйшаўшы рана з Марыяй з кватэры, ён папрасіў яе аднесці дыпламат да бабулі, а сам хуценька вярнуўся назад, дзе і зрабіў сваю чорную справу. Маці на яго жыццёвым шляху аказалася лішняй.

Гэтак жа, як і ў 40-гадовага Мікалая Лук'янцава з Чачэрска.

У адрозненне ад Вадзіма, сваю маці ён вельмі любіў. І яна яго таксама, аберагаючы сына ад бацькі, які прытрымліваўся прынцыпу: дзяцей песціць не трэба. На гэтай глебе пастаянна яшчэ з маленства адбываліся канфлікты, у выніку чаго маці з сынам, які паспеў ужо двойчы адседзець у калоніі (адзін раз за наўмыснае забойства), аддзяліліся і жылі ў другой палавіне хаты, маючы асобны ўваход. Калі не было выпіўкі, усё ішло, як ва ўсіх добрых людзей. Калі ж разам кулялі чарку — а гэта здаралася нярэдка, — Мікалай заўсёды знаходзіў прычыну для таго, каб палічыць маці рэбры. Ён біў яе і гумавым шлангам, і пластмасавай выбівалкай, і босай выганяў на мароз.

Маці гаварыла суседкам, што сын калі-небудзь заб'е яе, але ніколі не заяўляла аб пабоях у міліцыю, баючыся, што Мікалая зноў могуць пасадзіць на лаву падсудных. Прадчуванне жанчыны-пенсіянеркі спраўдзілася. У апошні раз, страціўшы ад п'янага чаду розум, сын лупцаваў п'яную маці на працягу трох гадзін. Калі арэхавая палка паламалася на частцы, ён пусціў у ход грабільна. На судзе душагуб спрабаваў усю віну ўзваліць на бацьку: маўляў, забойца — ён.

Трагічна абарвалася жыццё і жыхаркі вёскі Сіманавічы Лельчыцкага раёна Аўдоцці Зуевіч. Яна загінула ад рукі свайго мужа, лесніка Пасялковага лясніцтва Уладзіміра Валяр'янавіча, пра якога на рабоце ніхто не сказаў дрэннага слова. У гэтай сям'і выхоўвалася трое непаўналетніх дзяцей, якія былі сведкамі таго, як іхнія бацькі дружна цягнулі чарку. Пасля яе звычайна пачыналіся нейкія ўзаемныя папрокі. Так было і ў той майскі дзень, калі яны вярнуліся з вяселля. Аўдоцця пачала карміць дамашнюю жывёлу і незнарок перавярнула тазік з кормам. Гэтага было дастаткова, каб Уладзімір накінуўся на яе з кулакамі. Абараняючыся, жонка замахнулася на яго палкай. Муж адабраў яе і так раз'юшыўся, што нанёс ёй больш за 60 удараў, у выніку чаго яна тут жа памёрла.

Нібы кот з сабакам жылі ў пасёлку Зялёны Дуб Буда-Кашалёўскага раёна муж і жонка Зайцавы. У свой час Віктара судзілі за згвалтаванне, і ў аднавяскоўцаў ён не карыстаўся павагай. Калі выпіваў, страчваў розум: ганяўся за цешчай, зрабіў двайны пералом ніжняй сківіцы жонцы, выбіў ёй зубы. За хуліганства яму далі 10 сутак. Вярнуўшыся дадому, прапанаваў выпіць «міравую». Выпілі бутэльку самагону, схадзілі да родзічаў, дабавілі там, а потым яшчэ і дома. Пасля гэтага ў прысутнасці нажытых за пяць гадоў сумеснага жыцця траіх дзяцей Віктар пачаў дапытвацца, ці ўступала жонка ў яго адсутнасць з кім-небудзь у інтымную сувязь.

— Цябе чакала, — раздражнёна адказала тая і паплацілася жыццём.

Цэлы выхадны дзень п'янстваваў з жонкай і жыхар вёскі Дразды Мазырскага раёна Віктар Конюхаў, баец забойнага цэха каапзагатпрома. Прачнуўшыся сярод ночы, пачаў біць яе. Трое дзяцей пачалі плакаць, а самы старэйшы, Слава, спрабаваў утаймаваць бацьку. Як адначана ў пратаколе судова-медыцынскай экспертызы, той прафесіянальным ударам у шыю перарэзаў яму сонную артэрыю.

***

Так, усім нам зараз вельмі цяжка. Сённяшняе «пакалупанае» жыццё з усіх бакоў асупае нас нягодамі і нашчасцямі. Наступіла нейкая бязлітаснасць душ і сэрцаў, расце сцяна нецярпімасці адзін да аднаго. І слушна гавораць у народзе, што падтрымаць чалавека ў такіх сітуацыях больш за ўсё здольна спачуванне блізкіх людзей.

Так, сваякі, дапамогуць і словам, і справай, адвядуць ад цябе бяду, паселяць у тваёй душы надзею на лепшае. Але ж жыццё дае нямала прыкладаў і таго, што ніхто не здольны зрабіць чалавеку так балюча, як самыя блізкія людзі — сваякі, асабліва калі яны атручваюць свой розум алкаголем. Ад разумення гэтага робіцца страшна. І міжволі думаеш: так жыць далей нельга!

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАЛЯРОН

НАБЛІЖАЕЦЦА ДАЧНЫ СЕЗОН. НЕ ЗА ГАРАМІ ЛЕТНІ АДПАЧЫНАК. ДОБРЫМ СПАДАРОЖНІКАМ НА ТЭРЫТОРЫІ РЭСПУБЛІКІ, ЗАБРУДЖАНАЙ РАДЫЕНУКЛІДАМІ, СТАНЕ ДЛЯ ВАС

РАДЫЕМЕТР «ПРЫПЯЦЬ»

«ПРЫПЯЦЬ» ПАПЯРЭДЖВАЕ АБ РАДЫЯЦЫЙНАЙ НЕБЯСПЕЦЫ, БЕРАЖЭ ВАША ЗДАРОЎЕ!

ЛЬВОЎСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ «ПАЛЯРОН» прымае калектыўныя заяўкі на набыццё прыбора, які пакуль што каштуе 665 рублёў без уліку падатку на дабаўлены кошт.

ЗВЯРТАЦЦА: у Львове па тэл. (8-0322) 42-60-29 ці па адрасу 290619, Украіна, Львоў, вул. Угорская, 14, ВА «Палярон».

БАЦЬКАМ І ШКОЛЬНІКАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ!

МАЛОЕ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА «НІЦНТ» ПРЫ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

стварае камп'ютэрную базу даных навучэнцаў 8—10 класаў, якія жадаюць атрымаць вышэйшую адукацыю ў нашай Рэспубліцы.

Неабходнасць у гэтым выклікана пераходам вышэйшай школы на шматступеньчатую сістэму адукацыі. Для ўключэння ў базу даных неабходна даслаць на наш адрас наступныя звесткі аб сабе:

П. І. Імя па бацьку, № школы, клас, поўны паштовы адрас.

ІНФАРМАЦЫЯ ПРЫМАЕЦЦА ДА 1 ВЕРАСНЯ 1992 ГОДА.

НАШ АДРАС:

220050, г. Мінск-50, пр. Ф. Скарыны, д. 4, БДУ, мехмат, дырэктару «НІЦНТ».

КАМПАНІЯ «АРУС»

НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ЦЭНТР

ВЫКАНАЕ РАБОТЫ

па абследаванню будаўнічых канструкцый прамысловых прадпрыемстваў з устанаўленнем нясучай здольнасці і выдачай рэкамендацый па іх узмацненню.

Распрацоўвае праектна-каштарысную дакументацыю на каўбасны цэх прадукцыйнасцю да 1 т/зм, заглыблены халадзільнік ёмістасцю да 100 т на прыродным холадзе лёду і паветра.

Прапануем чарцяжы 5-пакаёвага 5-узроўневага жылога дома з убудаваным гаражом, чарцяжы неаепленага склада з пралётам 10, 12, 15 і 18 м.

Выканаем пастаўку металаканструкцый.

НАШ АДРАС:

220013, г. Мінск, а/с № 48. Тэл. (8-0172) 32-78-32.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту У. СЫЧОВА

ПЕРШЫ КВАРТАЛЬНЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 9

Белыя: Крh1, Ch5, Kd4, Kg2, п. d3 (5).
Чорныя: Крf1, Лf8, Kc3 пп: d6, e6, f2, h2 (7).
Мат за 8 хадоў.

Заданне № 10

Белыя: Кре8, Лf5, Cg5 (3).
Чорныя: Крh8, Лa5, Cb7, Kd5, Ke5 (5). Нічыя.

ЗВЕРЦЕ РАШЭННІ

Заданні №№ 1—4 першага квартальнага конкурсу рашэнняў развязваюцца наступным чынам:

№ 1. Ф. Пахль. 1. Фh5! 1. Фh7? Cf7! 1. Фh6?. Ce6!

№ 2. А. Цыдэн. 1. Лf6! 1. Cb4? Cc1!

№ 3. В. Гржаноўскі. 1. Крg7! 1. Лc6? K:f2! 1. Лg5? Cc6! 1. Фg5? Ф-f2!

№ 4. Г. Казюра, В. Кузьмічоў. 1. Кf4! e2 2. Фg6 (пагроза) Кр:f4 3. Kd5х. 1... Кh3 2. Фh5 Кр:f4 3. Фh4х. 1... Крg3 2. Фg6 Cg4 3. Кf5х.

Адказы на заданні прыслалі наступныя ўдзельнікі: Ю. Белазуб, К. Ярыга, С. Гурыновіч, Р. Крукоўскі, В. Лашманаў, Л. Шацько, С. Гурыновіч, В. Выкаў, Л. Ахрэм (усе з Мінска), А. Рослік (Крупскі раён), Я. Лазараў (Віцебск), В. Каваленка (Лепельскі раён), А. Кавецкі (Буда-Кашалёўскі раён), С. Сіляўкін (Лельчыцкі раён), М. Губчык (Слуцкі раён), М. Загорскі (Варысаў), У. Саналоў (Гомель), В. Сухараў (Віцебск), А. Кіслы і В. Емяльянаў (Гродзенская вобл.), І. Вуяк (Воранаўскі раён), М. Шчучка (Гомельская вобласць), В. Конахаў (Магілёў), У. Баранаў (Лунінецкі раён), С. Усянкоў (Добруш), І. Лыко (Бабруйск), С. Нагурны (Іванаўскі раён), В. Лобан (Любанскі раён) і іншыя.

КОНКУРС «ЦЫРУЛІКУ-65»

Бюлетэнь «Праблеміст Прыбужжа» аб'явіў юбілейны конкурс складання задач-мініяцюр з серыйнай гульнёй (каператыўны мат або пат, зваротны мат або іншыя ўмовы), прысвечаны 65-годдзю беларускага майстра спорту Цыруліка.

Тэрмін прысылкі задач — 1 ліпеня 1992 г.

Творы трэба высылаць на адрас: 231478, Гродзенская вобл., Дзятлаўскі р-н, в. Азяраны, «Цыруліку-65».

НА ДВОР'Е

7 красавіка

СЕННЯ ЎДЗЕНЬ ПА РЭСПУБЛІЦЫ ВОБЛАЧНАЕ З ПРАЯСНЕННЯМІ НАДВОР'Е. ТЭМПЕРАТУРА ПАВЕТРА Ў ВІЦЕБСКУ — 6—8, МІНСКУ І ГРОДНА—7—9, МАГІЛЁВЕ — 8—10, БРЭСЦЕ — 9—11, ГОМЕЛІ—10—12 ГРАДУСАЎ ЦЯПЛА.

У НАСТУПНЫЯ ДВОЕ СУТАК МЕСЦАМІ ПА РЭСПУБЛІЦЫ, У АСНОЎНЫМ ПА ПАЎДНЕВАМУ ЎСХОДУ ПРОЙДУЦЬ ДАЖДЖЫ. ТЭМПЕРАТУРА ПАВЕТРА ЎНАЧЫ АД 0 ДА 5, УДЗЕНЬ—6—11 ГРАДУСАЎ ЦЯПЛА.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

«Люстэрка». Інфармацыйная панарама, якая складаецца з паведамленняў карэспандэнтаў «СБ», БЕЛТА, ІТАР—ТАСС.

Рэпартаж з Салігорска. «Навошта лезці праз плот, калі побач брамка...»

Нататкі публіцыста. «Момант ісціны, ці Сёе-тое пра «цюбіканы сіндром».

Абітурыент-92. Ілля Мастковў гутарыць з намеснікам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь В. Стражавым аб розных асаблівасцях цяперашніх правіл па прыёму ў ВНУ рэспублікі.

Есць ідэя! «Як і дзе адпачываць дзецям Чарнобыля».

Успаміны пра ўспаміны. «Асабісты архітэктар Сталіна» (працяг).

«СПОРТЛАТО»

Вынікі 14-га тыражу

«Шэсць з 45»
2—10—12—36—39—40

«Пяць з 36»
4—9—10—16—35

РАДЫЁ

8 красавіка

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.00, 10.00, 15.00, 20.00, 23.00.

7.00 — «Радыёфакт». 8.05 — «У Савеце Міністраў рэспублікі». Урадавая прэс-служба паведамляе. 8.15 — «Дзелавы веснік». 9.15 — «Як далей жыць будзем?». Нататкі пісьменніка М. Пянката. 10.15 — для дзяцей. «Хвілінкі-весялінкі». 10.40 — Міх. Вышынскі. «Блакітныя дзверы». Апавяданне. 11.20 — «Студыя «Ява». Тэмы тыдня. 12.00 — «Апоўдні». 13.00 — «У абедз